

ПРА ЖЫЦЦЁ Ў АФРЫЦЫ І БАСКЕТБОЛЬНУЮ КАР'ЕРУ **12**

НЕСПАКОЙНЫ БАГДАД **13**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 СНЕЖНЯ 2019 г. СУБОТА № 233 (29100)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар НАЗАРАНКА, член Калегіі (міністр) па тэхнічным рэгуляванні Еўразійскай эканамічнай камісіі (ЕЭК):**

*«За гэты год мы ідэнтыфікавалі ўсе недапрацоўкі заканадаўства, якія дазваляюць той ці іншай краіне прымаць рашэнні па закрыцці прадпрыемстваў, нядопуску прадукцыі. Іх трэба ліквідаваць. Калі прадукцыя сапраўды небяспечная, яна не павінна вырабляцца і выпускацца ў абарачэнне. А калі бяспечная, нельга выкарыстоўваць інструменты тэхнічнага рэгулявання ці санітарныя, ветэрынарныя, фітасанітарныя меры, каб абараніць свой рынак і не пусціць канкурэнта. Канкурэнцыя павінна быць адкрытая і сумленная».*

# ЗРАБІЛІ Ў ГРОДНЕ ЁЛАЧКУ...



Фота БелТА.

**У абласным цэнтры ў парку Жылібера да свят ствараюць алею крэатыўных ёлак. Прадпрыемствы горада вырабілі іх згодна з уласным уяўленнем (а дзесьці і кіруючыся меркаваннямі маркетынгу), як павінна выглядаць навагодняе дрэва. Наведвальнікі незвычайнай алеі змогуць падзівіцца на «ёлкі» з сыру, каўбасы, бутэлек з-пад шампанскага, аўтамабільных пакрышак, фільтраў... Усё гэта фантастычнае відовішча будзе падсветлена каляровай ілюмінацыяй.**

## КОРАТКА

- **Беларусь і Казахстан могуць падпісаць дагавор аб пастаўках нафты ў 2020 годзе.**
- Радкі Купалы, БелАЗы і беларускія прадукты — у маскоўскім метро запусцілі цягнік да пяцігоддзя ЕАЭС.
- **Нацбанк выпусціць у абарачэнне памятныя манеты серыі «Архітэктурная спадчына Беларусі».**
- У Мінску плануюць пасля Новага года цэнтралізаваны збор ёлак для ўтылізацыі.
- **Коласаўскі тэатр падрыхтаваў містычную прэм'еру па апавяданні Яна Баршчэўскага.**
- «Белдзіпразем» пачаў выкарыстоўваць відэафіксацыю пры ўсталяванні меж зямельных участкаў.
- **Для барацьбы з несанкцыянаваным гандлем у Мінску будуць прымяняць відэаназіранне.**

Праблема

## ЯК НА ВАЛГАГРАДСКАЙ ЛЯМПАЧКІ МЯНЯЛІ

### Карэспандэнт «Звязды» высвятляла, чаму так цёмна на... асветленых вуліцах



Тая самая апора без свяцільні.

**Вечарам прайсціся ўздоўж цэнтральнай вуліцы Першамайскай у Магілёве адно задавальненне. Ліхтары асвятляюць дарогу так, што, як пяецца ў песні, хоць іголкі збірай. Некалькі крокаў убок — і ты на вуліцы Валгаградскай, той самай, якая, па словах тутэйшых жыхароў, часткова патанае ў цемры. І сапраўды, у адрозненне ад Першамайскай, дзе свяцільні праз кожныя трыццаць крокаў, тут ноччу можна і нагу зламаць, пакуль да чарговага «светлавога астраўка» дойдзеш.**

СТАР. 7

Гасцёўня

**Кацярына ДАМАНЬКОВА:**

## «У мяне часта пытаюцца, як стаць шчаслівай...»



**Даманькова — бадай, самая паспяховая беларуская мадэль. Сваю кар'еру яна пачынала ў Мінску. А ў 2006-м выйграла ў Нью-Ёрку прэстыжны міжнародны конкурс «Супермадэль свету». За дзесяцігоддзе ў мадэлінгу працавала з многімі вядомымі дамамі моды і ўдзельнічала ў шматлікіх фэшн-праектах, супрацоўнічала з брэндам жаночай бялізны Victoria's Secret. Пасля Кацярына скончыла МДІМА. Сёння яна мама трох дачок і заснавальніца паспяховага бізнес-праекта — інтэрнэт-рэсурсу Beautyhack.ru, які расказвае пра прыгажосць, здаровы спосаб жыцця і мацярынства. Як сумяшчаць работу і выхаванне дзяцей, пры гэтым падарожнічаць, займацца спортам і знаходзіць час для сябе, а таксама пра што славутую мадэль пытаюць пры сустрэчах і што яе натхняе, мы распыталі Кацярыну.**

СТАР. 8

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2020 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# АДКАЗНАЯ І СКРУПУЛЁЗНАЯ РАБОТА

**Шмат цёплых слоў учора гучала ў сценах будынка Адміністрацыі Прэзідэнта. Калектыў гэтай установы — палітычны штаб краіны — развітваўся з былым сваім кіраўніком, Наталляй Качанавай, і знаёміўся з новым — Ігарам Сергеенкам. Напярэдадні, 5 снежня, кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка прыняў адпаведнае кадравае рашэнне. А ўчора Наталля Качанава была абраная старшынёй Савета Рэспублікі, а яе былы намеснік — Валерый Міцкевіч — намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.**


Фота БелТА.

Новага кіраўніка і свайго пераемніка калектыву Адміністрацыі прадставіла сама Наталля Качанава. «Гэта паважаны, добры кіраўнік, галоўнае — добры чалавек, які разумее і ведае ўсе задачы, што стаяць сёння перад нашай краінай», — сказала яна. Наталля Качанава нагадала словы Аляксандра Лукашэнкі, сказаныя перад парламентарыямі, якія датычацца ўсіх дзяржаўных органаў, — пра тое, што самыя галоўныя прыярытэты ў палітыцы дзяржавы — незалежнасць, суверэнітэт краіны і работа з людзьмі. У сувязі з гэтым рашэнне прызначыць на пасаду такога чалавека, як Ігар Сергеенка, яна лічыць цалкам правільным і вывераным.

Пры гэтым сама Наталля Качанава, як кажуць, застаецца ў палітычнай абойме. Яна ўжо атрымала віншаванні ад спікера расійскага Савета Федэрацыі Валянціны Мацвіенкі, на яе як на кіраўніка верхняй палаты парламента надзвычай разлічвае і Прэзідэнт Беларусі. Наталля Качанава таксама запэўніла калег, што працягне працаваць над праектамі, якія ёй даручаны. Маецца на ўвазе куратарства над Оршай, Віцебскай вобласцю і іншае.

Пачуўшы шматлікія словы шчырай удзячнасці ў адрас сваёй папярэдніцы, Ігар Сергеенка прызнаўся, што некаторая напружанасць, напэўна, натуральная ў такой сітуацыі, цалкам знікла. «Ведаю не па чутках, са многімі з вас знаёмы асабіста, апарат Адміністрацыі Прэзідэнта — гэта высокапрафесійныя спецыялісты. Тым больш што займацца даводзіцца рознымі праблемамі. Так склалася, што 30 гадоў свядомага жыцця я праслужыў у органах дзяржаўнай бяспекі на розных пасадах, у розных рэгіёнах. Разумею, што гэта высокі гонар, адказнасць — кіраваць такім калектывам. Разлічваю на вашу дапамогу. Высока цаню работу кожнага з вас. Цаню ў людзях шчырасць, прыстойнасць, спагадлівасць, стараннасць».

Наталля Качанава таксама прадставіла і новага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта — Вольгу Чупрыс.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Парламенцкі дзённік

# ЗАКОНЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗРАЗУМЕЛЫЯ ЛЮДЗЯМ

**Адбылося першае арганізацыйнае пасяджэнне сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу сёмага склікання. Старшынёй Савета Рэспублікі абрана Наталля КАЧАНАВА. Яе намеснікам абраны Анатоль ІСАЧАНКА.**

Выбранню на гэтыя высокія дзяржаўныя пасады папярэднічала абмеркаванне іх кандыдатур. І Наталля Качанава, і Анатоль Ісачанка пачулі ад членаў Савета Рэспублікі шмат прыемных, заслужаных і справядлівых слоў. Абодва палітыкі — людзі добра вядомыя і аўтарытэтныя ў краіне.

Прамоўцы, у прыватнасці, адзначалі, што перш чым Наталлю Качанаву вылучылі на работу ў Адміністрацыю Прэзідэнта (кіраўніком якой яна была тры гады), за яе плячыма ўжо была вялікая і ўражлівая біяграфія. Нагадаем, пачынала працоўны шлях Наталля Качанава на радавых пасадах, кожная з якіх узбагачала яе жыццёвым і прафесійным досведам. Важнай прыступкай у яе кар'еры стала работа старшынёй Наваполацкага гарвыканкама. За сем гадоў у горадзе было шмат зроблена карыснага для яго жыхароў. Невыпадкова гараджане прысвоілі ёй у 2014 годзе званне ганаровага грамадзяніна Наваполацка.

У сваем слове да новага складу Савета Рэспублікі Наталля Качанава як яго старшыня акрэсліла тое кола пытанняў і праблем, якія бачацца ёй першачарговымі. Лейтматывам гучала думка, што ў аснове заканатворчай дзейнасці верхняй палаты парламента павінны быць інтарэсы людзей, іх паўсядзённыя клопаты і турботы, якія б дробныя яны ні здаваліся на першы погляд. А для гэтага варта часцей наведваць працоўныя калектывы, пастаянна бываць у рэгіёнах, больш шчыльна і змястоўна працаваць з дэпутатамі мясцовых Саветаў. Трэба эфектыўней выкарыстоўваць іх патэнцыял.

Вядома, у цэнтры ўвагі Савета Рэспублікі будуць важныя пытанні дзяржаўнага будаўніцтва. У гэтай справе трэба працягваць традыцыі папярэдняга складу верхняй палаты. На погляд Наталлі Качанавай, законы павінны быць зразумелыя людзям. Апроч унутраных пытанняў, неабходна будзе ўзмацніць дзейнасць на міжнароднай арэне, развіваць сувязі з парламентамі блізкіх і далёкіх краін.

У ходзе першага арганізацыйнага пасяджэння сесіі адбылося выбранне Пастаянных камісій Савета Рэспублікі і іх старшынь.

Старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве абраны Сяргей Сівец.

Старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па эканоміцы, бюджэце і фінансах абрана Таццяна Рунец.

Старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці абраны Віктар Лісковіч.

Старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Русы.

Старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы абраны Сяргей Рачкоў.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# АБРАНА КІРАЎНІЦТВА ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ

## Спікерам стаў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, віцэ-спікерам — Валерый МІЦКЕВІЧ

**Учора ў Авальнай зале Дома ўрада адкрылася першая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання. У парадку дня — фарміраванне рабочых органаў, абранне кіраўніцтва, вызначэнне пераліку Пастаянных камісій, абранне старшынь Пастаянных камісій, фарміраванне Савета Палаты прадстаўнікоў, абранне складу Пастаянных камісій і зацвярджэнне намеснікаў старшынь Пастаянных камісій.**

### Больш жанчын, больш моладзі і больш партый

Да абрання старшыні Палаты прадстаўнікоў пасяджэнне, згодна з рэгламентам, вяла **старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА.** Яна дала ацэнку выбарам і ахарактарызавала новы склад парламента. «Выбары прайшлі ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам у мірнай, спакойнай абстаноўцы і ва ўмовах свабоды і адкрытасці», — заявіла яна. Абраны 110 дэпутатаў, з іх 30 працавалі ў шостым скліканні, што, па словах старшыні ЦВК, дазваляе захаваць пераемнасць у рабоце парламента. Два дэпутаты з'яўляліся членамі Савета Рэспублікі шостага склікання.

У новаабранай ніжняй палаце беларускага парламента доля жанчын упершыню дасягнула 40 працэнтаў. Сярод дэпутатаў двое маладзейшых за 30 гадоў, чатыры — кіраўнікі тэрытарыяльных арганізацый Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Павялічылася колькасць дэпутатаў, якія прадстаўляюць палітычныя партыі, — такіх цяпер 21. У парламенце прадстаўлена пяць палітычных партый, адзін дэпутат — лідар Ліберальна-дэмакратычнай партыі, 11 дэпутатаў з'яўляюцца членамі Камуністычнай партыі, шэсць — Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці, два — Беларускай патрыятычнай партыі і адзін — Беларускай аграрнай партыі.

Сярод дэпутатаў шмат педагогаў, урачоў, юрыстаў, эканамістаў. Ёсць прафесійныя ваенныя, дыпламаты.

«Гэта значыць, Палата прадстаўнікоў складаецца з прафесіяналаў у розных сферах жыццядзейнасці, — заўважыла старшыня Цэнтрвыбаркама. — Няма сумненняў у здольнасці новасфарміраванага заканадаўчага органа на высокім узроўні выконваць свае функцыі».

### Каласальны дзяржаўны вопыт

Кандыдатуру Уладзіміра Андрэйчанкі, дэпутата па Докшыцкай выбарчай акрузе № 22, на пасаду старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання прапанаваў дэпутат ад Магілёўскай-Ленінскай выбарчай акругі № 84 Ігар Марзалюк.

Ён нагадаў пра запатрабаванасць арганізацыйнага таленту Уладзіміра Андрэйчанкі ў першых трох скліканнях Савета Рэспублікі. Пасля гэтага Уладзімір Андрэйчанка ўзначальваў ніжнюю палату парламента. «Яшчэ адна важная дэталь: ва Уладзіміра Паўлавіча ўсталяваліся добрыя адносіны з многімі палітыкамі і кіраўнікамі парламентаў іншых краін, што адбілася на развіцці міжнародных сувязяў Палаты прадстаўнікоў», — дадаў Ігар Марзалюк.

Некалькі дэпутатаў выступілі з прамовамі ў падтрымку гэтай кандыдатуры. Іншых прапаноў на пасаду спікера не прагучала. Старшыня Палаты прадстаўнікоў быў абраны тайным галасаваннем большасцю галасоў ад поўнага складу ніжняй палаты парламента (109 галасоў «за» і толькі адзін «супраць»).

Пасля абвяшчэння вынікаў тайнага галасавання і прыняцця адпаведнай пастановы аб абранні спікера Уладзімір Андрэйчанка заняў месца старшыні і ўзначаліў пасяджэнне сесіі. Ён падзякаваў калегам за аказаны давер і дадаў, што ацэнка яго работы — гэта ў тым ліку і вынік работы дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў шостага склікання. Датычна новага складу парламента спікер выказаў упэўненасць у тым, што ўсе пастаўленыя задачы будуць выкананыя.

### Не прывілея, а адказнасць

На пасаду намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў таксама была прапанавана адна кандыдатура — Валерыя Міцкевіча. Яе прадставіў ужо ў якасці старшыні Уладзімір Андрэйчанка. Паводле яго слоў, «Валерый Вацлававіч — чалавек з устаноўленымі палітычнымі поглядамі, адданы беларускаму народу. Ён вельмі кампетэнтны, адказны і вопытны кіраўнік».

Валерый Міцкевіч пяць гадоў працаваў намеснікам міністра юстыцыі, узначальваў Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў. З 2009 года — намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«Я цудоўна разумею, што пасада намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў — гэта не прывілея, гэта адказная работа, справіца з якой можна толькі пры вашай падтрымцы, — сказаў у сваім выступленні Валерый Міцкевіч. — Наперадзе складаная работа па вывадзе краіны на ўстойлівыя дынамічныя тэмпы развіцця. У нас для гэтага ёсць усе ўмовы, а галоўнае — адзінства народа і палітычная воля краіны для руху наперад».

На пасаду віцэ-спікера Палаты прадстаўнікоў Валерыя Міцкевіча абралі аднагалосна.

### Камісіі — па традыцыі

Палата прадстаўнікоў таксама сфарміравала 14 Пастаянных камісій, як гэта было з другога да шостага склікання. У першым скліканні было ўтворана 11 камісій.

У сёмым скліканні будуць працаваць профільныя камісіі па заканадаўстве; па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; па нацыянальнай бяспецы; па эканамічнай палітыцы; па бюджэце і фінансах; па аграрнай палітыцы; па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы; па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі; па адукацыі, культуры і навуцы; па працы і сацыяльных пытаннях; па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы; па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі; па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве; па міжнародных справах.

Адбыўся папярэдні запіс дэпутатаў, якія пажадалі працаваць у той ці іншай камісіі. На чарговым пасяджэнні першай сесіі Палаты прадстаўнікоў сёмага склікання 11 снежня будуць абраныя старшыні і склад Пастаянных камісій.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Блізкая ўлада

# КАБ ЛЮДЗЯМ ДАПАМАГЧЫ, ТРЭБА ІНШЫ РАЗ ПАЙСЦІ НА КАМПРАМІС

## Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Іван Лаўрыновіч выслухаў тэлефонныя звароты і правёў прыём грамадзян у Ленінскім раёне Гродна

**У асноўным звярталіся з набалелым. Адны імкнуліся вырашыць, хто павінен займацца ўборкай прыдамавой тэрыторыі. Другіх непакоіў стан роднай вёскі і тых аб'ектаў, якія пустуюць. Жыхары ўзбярэжжа рэчкі Гараднічанкі звярнулі ўвагу на падтапленне двароў і дамоў, якое здараецца ў час паводкі.**


grodnonews.by

Першы быў прыняты званок з гарадскога пасёлка Казлоўшчына Дзятлаўскага раёна. Праўда, мужчына не стаў сябе называць, а паведаміў, што ў пасёлку варта звярнуць увагу на сацыяльна важныя аб'екты. У прыватнасці, мужчына выказаў прапанову пашырыць ложкавы фонд мясцовай бальніцы за кошт былой школы, якая цяпер часткова пустуе.

Праблема добраўпарадкавання гарадскога пасёлка Казлоўшчына будзе вырашацца, адзначыў Іван Лаўрыновіч. Населены пункт разам з Любчай трапіў у лік пасёлкаў Гродзенскай вобласці, якія падпадаюць пад рэспубліканскую праграму на будучы год. Згодна з ёй, тут будуць аднаўляцца дарогі, сацыяльныя аб'екты, жылы фонд. Цяпер рыхтуецца праектна-архітэктурнае рашэнне, вясной пачнуцца работы — сродкі на гэта закладзены ў абласны бюджэт.

Не першы раз падчас прыёмаў чыноўнікаў ставяцца пытанні па рамонтных работах. Вось і гэтым разам да памочніка Прэзідэнта звярнуўся жыхар мікрараёна Фолюш абласнога цэнтра, якога непакояць бясконцыя работы па пракладцы цеплатрасы. У выніку ўвесь двор доўгі час разрыты, трубы ляжаць наверсе. Іван Лаўрыновіч абяцаў пабываць на месцы і разабрацца, чаму там марудна ідзе гэты працэс. На кантроль будзе ўзнята і праблема стану старых дамоў. З такой просьбай звярнулася жыхарка прыватнага сектара Алена Васілеўна. У яе драўляны дом, пячное ацяпленне, але ў суседніх кватэрах ніхто не жыве, таму трэба вельмі шмат паліва, каб утрымліваць цяпло. У той жа час арэндныя кватэры пры адпаведным рамонце можна было б засяліць.

— Гэта пасляваенныя дамы, і трэба паглядзець гаспадарскім вокам, што там можна зрабіць, — заўважыў Іван Лаўрыновіч. — Таму адпаведныя службы павінны гэтым заняцца. Вядома, не ўсе могуць атрымаць добраўпарадкаванае жыллё, а вось адрамантаваць, палепшыць стан таго, што ёсць, рэальна.

Праблема з жыхарамі вуліц, якія знаходзяцца на беразе рэчкі Гараднічанкі, будзе вырашацца больш кардынальна. Падтапленне двароў і дамоў здараецца тут даволі часта. А не так даўно каля аднаго з будынкаў змыла мост, і людзі ходзяць у абход, расказаў падчас прыёму пенсіянер Тадэвуш Калікставіч. Яму паведамілі, што тэрыторыя берагоў Гараднічанкі згодна з генеральным планам развіцця горада будзе добраўпарадкавана, алеператворыцца ў зялёную зону без жылых забудоў. Адпаведна, людзей, якія жывуць на некалькіх вуліцах каля рэчкі, будуць перасяляць у добраўпарадкаваныя кватэры. Праект па развіцці тэрыторыі распрацуюць налета, самі работы распачнуцца ў трэцім квартале.

— Калі была паводка, мы выязджалі разам з мэрам, там будынкі знаходзяцца ў небяспечным стане. Умацаванне берага не палепшыць сітуацыю, яна праз нейкі час зноў паўторыцца. Людзей трэба адназначна перасяліць, даць ім нармальнае жыллё згодна з прапіскай і метражом. Тым больш што там жывуць у асноўным пенсіянеры, — зазначыў Іван Лаўрыновіч.

Даволі працяглая размова адбылася ў памочніка Прэзідэнта з жыхаркай вёскі Масткі, што пад Гродном. Людміла Сяргееўна пераехала ў бацькоўскі дом з горада, завяла статак кароў. Тут жыве разам з дзецьмі і вядзе падсобную гаспадарку. Падчас прыёму жанчына расказала, што паша, якую ёй выдзелілі, знаходзіцца далёка ад дома, сачыць за жывёламі на такой адлегласці немагчыма. У выніку здараюцца патравы на калгасных палях, жанчыне выпісваюць штраф. Людміла хацела б развівацца, стварыць фермерскую гаспадарку, але не ведае, як гэта зрабіць.

— Такім людзям трэба дапамагаць, — лічыць Іван Лаўрыновіч. — У мяне адбудзецца размова з кіраўніком гаспадаркі, патлумачу, што трэба выдзеліць зямлю, каб людзі займаліся падсобнай гаспадаркай. У некаторых выпадках трэба ісці на кампраміс і рабіць усё неабходнае для таго, каб аказаць рэальную дапамогу чалавеку.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Фінансы

# Золатавалютныя рэзервы краіны склалі амаль 9,2 мільярда долараў

**Паводле стану на 1 снежня нашы міжнародныя рэзервовыя актывы склалі 9158,9 мільёна долараў ЗША (у эквіваленце).**

За лістапад золатавалютныя рэзервы знізіліся на 34,9 мільёна долараў (на 0,4 %) пасля росту ў кастрычніку на 362,9 мільёна долараў (на 4,1 %). Зніжэнне ўзроўню рэзервовых актываў па выніках лістапада абумоўлена планавым пагашэннем урадам і Нацыянальным банкам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на агульную суму 193 мільёна долараў.

Падтрыманню ўзроўню золатавалютных рэзерваў у лістападзе спрыялі купля замежнай валюты Нацыянальным банкам на таргах ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа» і паступленне замежнай валюты ў бюджэт, у тым ліку ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты.

Як адзначае прэс-служба Нацбанка, згодна з асноўнымі кірункамі грашова-крэдытнай палітыкі на 2019 год, аб'ём міжнародных рэзервовых актываў на 1 студзеня 2020 года павінен скласці не менш за 7,1 мільярда долараў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Розныя-роўныя

# Інклюзія: адукацыя і кар'ера

**III Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Беспярэпынная прафесійная адукацыя для людзей з асаблівымі патрэбамі» прайшла ў Інстытуце інфармацыйных тэхналогій БДУІР. Яна аб'яднала экспертаў з Беларусі, Расіі, Швейцарыі, Узбекістана, Латвіі і Польшчы.**

— Наша мерапрыемства прысвечана ў першую чаргу пытанням, звязаным з інклюзіўнай адукацыяй і пашырэннем даступнасці прафесійнай адукацыі для асоб з асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі. Але не толькі навучальныя матэрыялы павінны быць сёння адаптаваныя для ўсіх членаў грамадства. Не менш важнае пытанне — фарміраванне экааcяроддзя для прафесійнага і творчага развіцця асобы, — падкрэсліў падчас адкрыцця канферэнцыі **рэктар БДУІР Вадзім БОГУШ.**

Прывітальнае слова **міністра замежных спраў Беларусі, старшыні Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА Уладзіміра МАКЕЯ** зачытала адказны сакратар Нацыянальнай камісіі Наталля Шчасновіч: «Інклюзіўная адукацыя ў Беларусі з'яўляецца прыярытэтнай для падрыхтоўкі кадраў новага пакалення, здольных забяспечыць адаптацыю ва ўмовах лічбавай трансфармацыі. Хуткі рост сучасных тэхналогій патрабуе ад асоб з асаблівымі патрэбамі, як і ад усяго насельніцтва ў цэлым, новых кампетэнцый, якія дазваляюць бязбольна ўключацца ў сучасныя працэсы».

Сёлета тэматыка канферэнцыі значна пашырылася. У цэнтры ўвагі былі пытанні не толькі інклюзіўнай IT-адукацыі, але і сацыялізацыі інвалідаў у грамадстве.

Падчас мерапрыемства эксперты абмеркавалі digital skills і soft skills для асоб з асаблівымі патрэбамі ва ўмовах лічбавай трансфармацыі, развіццё інклюзіўнай адукацыі з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Удзельнікі з розных краін абмяняліся перадавым вопытам, які дазволіць разам зрабіць крок наперад, пераадолець лічбавы разрыў і стварыць роўныя магчымасці для доступу да інфармацыі людзей з асаблівымі патрэбамі.

Гасцямі мерапрыемства сталі дзіцячы інклюзія-хор «Радасць душы», а таксама інваліды-калясачнікі, якія жывуць актыўным жыццём. Гэтыя людзі не па чутках знаёмы з праблемамі інвалідаў і змаглі падзяліцца сваім бачаннем арганізацыі комплекснага падыходу да фарміравання безбар'ернага асяроддзя, паспяховай рэалізацыі асобаснага і прафесійнага развіцця, а таксама расказаць аб праблемах, якія іх хвалююць.

**Свае прапановы і рэкамендацыі па выніках канферэнцыі ўдзельнікі плануюць прадставіць у Міністэрства адукацыі, Камісію па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі для падрыхтоўкі праекта закона «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі».**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Французы пратэстуюць супраць пенсійнай рэформы



У Францыі праходзіць маштабная агульнанацыянальная забастоўка прафсаюзаў супраць пенсійнай рэформы. Пра гэта паведаміла РІА «Навіны». Мяркуецца, што акцыя будзе бестэрміновая. У Парыжы ўчора спыніліся адзінаццаць ліній метро, адзначаліся збоі ў рабоце электрычак, высакахуткасных цягнікоў TGV і аўтобусаў. Нацыянальная кампанія чыгунак SNCF абвясціла, што рух будзе моцна ўскладнены да 12 снежня. У страйку таксама ўдзельнічаюць медработнікі, настаўнікі, адвакаты і студэнты. Адзначаецца, што пратэсты падтрымлівае 68 працэнтаў французаў. Работу над пенсійнай рэформай завяршае французскі ўрад, які мае намер правесці яе праз парламент у пачатку 2020 года. Рэформа прадугледжвае змену прынцыпу налічэння выплат і пераход да сістэмы пенсійных балаў. У выпадку захавання пенсійнага ўзросту 62 гады (права выхаду на пенсію) для атрымання поўнай пенсіі (без адлічэнняў) французам давядзецца працаваць мінімум да 64 гадоў. Гэты ўзрост будзе павышацца для таго, каб пенсійная сістэма заставалася бездэфіцытнай.

## Вайскоўцы ЗША падтрымалі інтэрвенцыю ў іншыя краіны

Трое з чатырох амерыканскіх ваенных лічаць, што інтэрвенцыя ў іншыя краіны — гэта правільная знешняя палітыка, паведамляе Military Times са спасылкай на апошнія даследаванні. Апытанне праводзілася Прэзідэнцкім фондам і інстытутам Рональда Рэйгана. У ім узяло ўдзел каля тысячы амерыканскіх вайскоўцаў, большая частка з іх заявіла, што Вашынгтон павінен весці больш актыўную знешнюю палітыку. «Нягледзячы на тое што сацыёлагі даўно адзначаюць існаванне ізаляцыяніскіх настрояў у ЗША, яны ўяўляюць хутчэй меншую частку», — адзначаецца ў рэзюмэ даследавання. У прыватнасці, апытанне паказала, што 76 працэнтаў рэспандэнтаў падтрымлівае выкарыстанне амерыканскай ваеннай сілы за мяжой незалежна ад таго, ці існуе прамая пагроза для ЗША. Акрамя таго, 65 працэнтаў выказалася за захаванне амерыканскай сеткі ваенных баз за мяжой.



## Галоўным колерам 2020-га названы «класічны сіні»

Міжнародны даследчы інстытут Pantone абраў галоўны колер 2020 года. Пра гэта кампанія абвясціла на афіцыйным сайце і ў сваім Instagram-акаўнце. Колерам года прызнана адценне Pantone 19-4052 Classic Blue, або «класічны сіні». «Гэта спакойнае адценне, элегантнае ў сваёй прастаце. Яно наводзіць на думкі аб змрочным небе і дае адчуванне абароненасці», — апісалі колер адміністратары акаўнта Pantone. Раней у лютым віцэ-прэзідэнт Pantone Лоры Прэсман прадказала, што галоўным колерам 2020 года стане сіні. Па словах эксперта, менавіта марскія адценні будуць асноўнай крыніцай натхнення для будучых дызайнерскіх калекцый. Як вядома, амерыканскі інстытут колеру Pantone выбірае галоўнае адценне з 2000 года. У сярэдзіне XX стагоддзя кампанія распрацавала стандартызаваную сістэму падбору колеру, у якой выкарыстоўваецца лічбавая індыкацыя. Узоры рэгулярна выпускаюцца ў спецыяльных каталогах. Галоўным колерам 2019 года Pantone выбрала адценне 16-1546 Living Coral, ці «жывы каралавы».

З нагоды

# САКРЭТЫ МАЛАДОСЦІ «АЛЕСІ»

## Беларускі часопіс для жанчын адзначыў 95-годдзе

У далёкім 1924-м ён выйшаў упершыню як «Беларуская работніца і сялянка», потым змяніў назву на «Работніца і калгасніца Беларусі», пасля вайны аднавіў выхад як «Работніца і сялянка», а з 1995-га стаў «Алесяй». Аднак, нягледзячы на перамену назваў і месцаў, галоўнай заставалася ідэя: гэты беларускі часопіс рабілі пераважна жанчыны, якія пісалі пра жанчын і для жанчын — тое, што хвалюе і цікавіць, тое, што натхняе і будзе карыснае, дапаможа справіцца з жыццёвымі выпрабаваннямі і выйсці з іх пераможцай. Сёлета «Алеся», ужо пяць гадоў як частка Выдавецкага дома «Звязда», святкуе 95-годдзе выхаду першага нумара. З гэтай нагоды ў Нацыянальным мастацкім музеі днямі адбылася ўрачыстая вечарына «Жанчыны трапяткі сусвет», а таксама прайшла выстаўка аднаго дня, прысвечаная беларускім жанчынам у мастацтве.



— Гэта не проста юбілей асобнага выдання — за датай 95 гадоў стаіць цэлая гісторыя многіх сем'яў і пакаленняў, гісторыя краіны, у якой таленавітыя, руплівыя і шчырыя работніцы і сялянкі з'яўляюцца самым галоўным яе скарбам і багаццем, — зазначыў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй КУНЦЭВІЧ,** які зачытаў віншавальны адрас ад кіраўніка дзяржавы калектыву часопіса «Алеся».

Таксама супрацоўнікі, у тым ліку галоўны рэдактар выдання **Ларыса РАКОЎСКАЯ,** былі адзначаны граматамі і падзякамі Міністэрства інфармацыі і пачулі нямала цёплых і добрых слоў ад мужчын-кіраўнікоў — намесніка міністра інфармацыі **Ігара БУЗОЎСКАГА,** дырэктара Выдавецкага дома «Звязда» **Паўла СУХАРУКАВА.** Але, кажуць, самыя шчырыя кампліменты — тыя, якія робіць жанчына жанчыне. Іх таксама прагучала нямала — этнограф і тэлевядучая Ларыса Мятлеўская расказала, што знаёмая з часопісам яшчэ з дзяцінства, бо «Работніцу і сялянку» выпісвала і пільнавала яе бабуля ў вёсцы; старшыня беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Таццяна Філімонава прызналася, што першыя модныя выкрайкі яшчэ падлеткам знаходзіла менавіта ў «Алесі», а старшыня Беларускага саюза жанчын Марыяна Шчоткіна зазначыла, што адзін з сакрэтаў маладосці «Алесі» — творчы пошук і ўменне на працягу амаль стагоддзя захоўваць актуальнасць і заставацца найлепшым сябрам для многіх жанчын.

Спецыяльна да свята Мастацкі музей зладзіў выстаўку аднаго дня: сем мастацкіх твораў у фарбах і металле адлюстравалі вобразы вядомых беларусак — паэткі Цёткі і балерыны Людмілы Бржазоўскай, сястры нацыянальнага героя партызанкі Арыядны Казей, мастачкі-графіка Аляксандры Паслядовіч, зборны вобраз беларускіх жанчын наогул. Упрыгожылі вечарыну выступленні педагогаў і выпускнікоў Маладзечанскага музычнага каледжа імя М. К. Агінскага, а таксама адмысловы модны паказ традыцыйных жаночых строяў з розных рэгіёнаў нашай краіны.

Натуральна, шмат гаварылі на імпрэзе пра людзей, якія непасрэдна стваралі часопіс, — дачку чыгуначніка Марусю Муратаву, якая ў зусім маладым узросце стала першым галоўным рэдактарам выдання, і Аляксандру Ус, якая аднаўляла «Работніцу і сялянку» пасля Вялікай Айчыннай вайны. Падарункі і віншаванні калектыў «Алесі» падрыхтаваў для сваіх былых калег і галоўных рэдактараў — Марыі Карпенкі, Раісы Баравіковай і Тамары Бунты. Кожная з іх падзялілася ў адказ цёплымі ўспамінамі і нават вершаваным прызнаннем у каханні.



— Мяне прызначылі галоўным рэдактарам у 1972-м, а ўсяго праз два гады быў першы вялікі юбілей часопіса — 50 гадоў з выхаду першага нумара. Гэта было такое вялікае свята! — згадвае **Марыя КАРПЕНКА**, жанчына-легенда, якая запомнілася чытачам не толькі высокім журналісцкім майстэрствам, але і актыўнай грамадскай дзейнасцю; пры ёй выданне істотна пашырыла кола тэм і рубрык, а адпаведна вырас тыраж (да 1,5 мільёна паасобнікаў). — Мы запрасілі жанчын-рэдактараў з усіх саюзных рэспублік, з кожнай вобласці Беларусі прыехалі аўтобусы, поўныя найлепшых жанчын — перадавікоў вытворчасці і грамадскага руху. А грошай на правядзенне юбілею нам амаль не далі. І тады я пайшла да ўсіх, пра каго мы пісалі, і артысты і калектывы пагадзіліся выступіць бясплатна, да таго ж мой муж дапамог, запрасіў ваенны аркестр, так што ў нас атрымалася здзейсніць у філармоніі вялікі ўрачысты вечар з канцэртам. Але ад усіх хваляванняў у мяне начыста прапаў голас, і я папрасіла дапамагчы тагачаснага рэдактара «Звязды» Міхаіла Іванавіча Дзяльца, які цудоўна справіўся з роляй вядучага. Назаўтра, калі праводзілі гасцей, села ў пустой рэдакцыі і думаю: «Вось так і скончыўся мой трэці год работы» — але гэта я яшчэ не ведала, якія дваццаць пяць гадоў чакаюць наперадзе!..



Марыя Іосіфаўна папрасіла арганізатараў імпрэзы: «Вы толькі на 100-годдзе запрасіце». А новы дырэктар Нацыянальнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі Аляксандр Пятровіч прапанаваў адзначыць такую вялікую дату якраз у Вялікім — супраць чаго, уласна, ніхто з прысутных не запярэчыў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

***Калектыў «Звязды» таксама шчыра віншуе з 95-годдзем рэдакцыю часопіса. Са святам, калегі! Доўгіх гадоў жыцця «Алесі»!***

Дабрачыннасць

# БЫЦЬ ПАТРЭБНЫМ ЛЮДЗЯМ МОЖНА І Ў 90

### УЗРОСТ — ПАНЯЦЦЕ АДНОСНАЕ

**Як правіла, калі мы гаворым пра валанцёраў, то ўяўляем сабе маладых людзей. Але ў апошнія гады ўсё часцей у іх шэрагі ўліваюцца людзі 60+. А самым дарослым беларускім валанцёрам і наогул па 90 гадоў! Як, напрыклад, былой настаўніцы Алене Чарнуха з Пухавіцкага раёна, якая, не лічачыся са сваім узростам, стала добраахвотна дапамагаць іншым пажылым людзям і ўсяляк падтрымліваць тых, хто мае ў гэтым патрэбу.**


Фота з сайта redcross.by.

*Здымак носіць ілюстрацыйны характар.*

А яе аднагодка Ганна Пятрова з Вілейкі тры гады таму пачала вучыць усіх ахвотных вязаць шыдэлкам і тэхніцы пляцення карункаў фрывалітэ, а ў 2017 годзе, калі ёй споўнілася 88, стала прапагандаваць здаровы спосаб жыцця і правільнае харчаванне, натхняючы іншых сваім прыкладам. Яшчэ адзін валанцёр сярэбранага ўзросту, 89-гадовая Наталля Гуз з Гомельскай вобласці, часта наведвае пажылых людзей, якія ляжаць у бальніцы сястрынскага догляду, і падтрымлівае іх сваёй творчасцю — песнямі і вершамі...

Валанцёраў старэйшага ўзросту ў нашай краіне апошнім часам становіцца ўсё больш — на сённяшні дзень іх налічваецца ўжо амаль тры тысячы. Іх клопатам ахоплена амаль 20 тысяч чалавек.

А каля вытокаў «сярэбранага» валанцёрства стаяў Мінск, дзе пры падтрымцы аддзялення сацыяльнай дапамогі Ленінскага раёна ў 1994 годзе адкрыўся першы сацыяльны цэнтр «Ветэранскі прытулак» — свайго роду цэнтр валанцёрскай дапамогі. Пра гэта на адкрыцці першага рэспубліканскага злёту валанцёраў сярэбранага ўзросту (60+) расказаў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК.** У цэлым «сярэбранае валанцёрства» пачало актыўна развівацца дзесьці ў пачатку 2000-х, і з кожным годам колькасць добраахвотнікаў расце. Так, паводле слоў Аляксандра Румака, за тры апошнія гады колькасць такіх валанцёраў павялічылася на 50 %: з дзвюх тысяч чалавек у 2017 годзе — да трох тысяч у 2019-м.

Пры выхадзе на пенсію ў чалавека з'яўляецца больш вольнага часу, і тыя людзі, якія захавалі актыўную жыццёвую пазіцыю і гатовыя бескарысна аддаваць свой час, клопат і падтрымку іншым, прыходзяць у валанцёрскі рух. Яны дапамагаюць пажылым людзям, інвалідам, сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў... Пры гэтым у нашага «сярэбранага» валанцёрства — жаночае аблічча: з трох тысяч добраахвотнікаў 2,8 тысячы складаюць прадстаўніцы прыгожай паловы. Але тым не менш цешыць, што ўжо амаль кожны 10-ы з'яўляецца мужчынам.

У шэрагі «сярэбраных» добраахвотнікаў прымаюць людзей ад 55 гадоў, верхняй мяжы няма. І трэба адзначыць, што і даследаванні навукоўцаў, і жыццёвы вопыт сведчаць пра тое, што людзі, якія бескарысліва дапамагаюць іншым, адчуваюць сябе лепш і жывуць даўжэй. Так, у многіх краінах ёсць такая ініцыятыва, калі пажылыя людзі добраахвотна дапамагаюць настаўнікам школ — як сацыяльныя работнікі, як выхавальнікі. За такімі добраахвотнікамі назіралі навукоўцы на працягу некалькіх гадоў, кантралюючы іх рост, вагу, узровень халестэрыну, ціск і многія іншыя параметры. І высветлілася, што яны маюць лепшае самаадчуванне і лепшыя паказчыкі здароўя, чым тыя, хто гэтым не займаецца. Гэта навуковыя звесткі. Магчыма, так адбываецца таму, што вельмі многае ў нашым жыцці залежыць ад стану душы. Можна ў 45 ужо адчуваць сябе старым і хворым, а можна і ў 80 гадоў думаць пра сябе як пра чалавека, які можа цікавіцца жыццём іншых людзей і падтрымліваць іх. І нярэдкія выпадкі, калі здароўе пры гэтым «падцягваецца».

**Святлана БУСЬКО.**

**У Мінску прайшоў першы рэспубліканскі злёт валанцёраў сярэбранага ўзросту (60+), у якім узяло ўдзел больш за 200 добраахвотнікаў з усіх куткоў нашай краіны. Яны прадставілі свае праекты, падзяліліся сваім вопытам і ведамі, абмеркавалі далейшае развіццё валанцёрскага руху і той унёсак, які могуць зрабіць у вырашэнне сацыяльных праблем. Арганізатарам мерапрыемства выступіла Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі.**

# КОЛЕР НАСТРОЮ — НАВАГОДНІ

## Гарады і вёскі пступова прыбіраюцца да калядных свят

**Кожны дзень тэлебачанне ды іншыя СМІ расказваюць нам, якія незвычайныя інсталяцыі, фотазоны, розныя навагоднія цікавінкі паяўляюцца ў сталіцы. Але ж і ў рэгіёнах адчуваецца набліжэнне свята. Асобныя райцэнтры, аграгарадкі, пасёлкі дзякуючы фантазіі і намаганням іх жыхароўператвараюцца на вачах.**


Брэст.

І хоць у ваколіцах Брэста снегу яшчэ наогул у вочы не бачылі — тут працягваюць цвісці хрызантэмы, а на Маларытчыне тыдзень таму зацвіла алыча, — абласны цэнтр павольна, але настойліва пагружаецца ў калядную ілюмінацыю. Магазіны, офісы, кавярні-рэстараны спаборнічаюць адно з адным у прыгажосці афармлення. Многія прывозяць еўрапейскія ідэі разам з іх атрыбутыкай (мяжа Еўрасаюза побач) ды ўпрыгожваюць свае ўстановы. Іншыя робяць упор на ўласную фантазію і ствараюць нешта эксклюзіўнае. Але з кожным днём на вуліцах горада становіцца больш навагодняй урачыстасці.

Запрацавалі калядныя кірмашы. Для іх у абласным цэнтры вызначана пяць асноўных пляцовак. Самая першая адкрылася ў сярэдзіне лістапада каля Цэнтральнага рынка. Навагодняя прадукцыя, тавары ад майстроў-рамеснікаў, цацкі, посуд прадаюцца ў стылізаваных драўляных дамках. Каля чатырох дзясяткаў такіх дамкоў з'явілася на традыцыйна кірмашовай вуліцы Гогаля, вядомай сваімі незвычайнымі ліхтарамі. Упершыню кірмашовай стала плошча Леніна. Тут і на прылеглай вуліцы Пушкінскай з'яўляюцца такія ж дамкі, дзе не толькі пастпова разгортваецца святочны гандаль сувенірамі і падарункамі, але і хутка задымяцца гарачыя бліны, наведвальнікам прапануюць духмяны чай, а таксама гарачы шакалад і глінтвейн. Яшчэ два кірмашы пачынаюць сваю работу ва ўсходнім раёне горада. Напрыклад, каля гандлёвага цэнтра «Экватар» арганізатары падрыхтавалі цікавую культурную праграму, якая пройдзе ў сапраўдным калядным шатры. Тут можна будзе не толькі глядзець, але і ўдзельнічаць у забаўлянках і пастаноўках. Тэматычны кірмаш арганізуюць і каля гандлёвага цэнтра «Алмі».

Тым часам гандляры ўжо дамаўляюцца з лясгасамі пра пастаўку жывых ёлак. Іх абяцаюць прадаваць на 15 пляцоўках, ва ўсіх мікрараёнах абласнога цэнтра. А вось пра галоўную навагоднюю ёлку камунальныя службы пакуль нічога не кажуць. Вядома, што яе афармленне будзе прынцыпова адрознівацца ад мінулагодняга, але чым — трымаецца ў сакрэце. У юбілейны для Брэста год камунальнікі абяцаюць здзівіць гараджан. Чакаць засталося нядоўга.

Не жадаюць адставаць ад абласнога цэнтра і маленькія гарады. Мікашэвічы Лунінецкага раёна, вядомыя сваім прадпрыемствам «Граніт», заўсёды прыгожа прыбіраліся да навагодніх свят.

— На гэты раз галоўная навагодняя інсталяцыя размесціцца на плошчы насупраць Дома культуры, — расказала **намеснік старшыні Мікашэвіцкага гарвыканкама Ларыса АЛЬГОМЕЦ.** — Усю работу бярэ на сябе РУВП «Граніт». На прадпрыемстве ёсць майстры віртуознай зваркі. З металічных прутоў яны зварваюць фігуркі аленяў, саней з казачнымі героямі, розных дрэў — і нашых, і экзатычных. Потым усё гэта арыгінальна падсвечваецца, і з'яўляюцца цэлыя казачныя сюжэты. Святочнымі днямі тут гуляюць моладзь, дзеці, ды і дарослыя, любяць рабіць сэлфі. Сёлета майстры рыхтуюць нешта новае, што стане святочным сюрпрызам для ўсіх гараджан.

Папрыгажэў перад святамі і пасёлак Белавежскі Камянецкага раёна. Прыбраліся офісныя будынкі, кавярні і крамы. Асабліва вылзяляецца кантора ААТ «Белавежскага». «А яшчэ ў нас жыхары дружна далучаюцца да святочнай кампаніі, — расказала **старшыня Белавежскага сельвыканкама Жанна ХІЛЮЦІЧ.** — Многія дамы ператвараюцца ў казачныя церамкі. Мы конкурс праводзім, адзначаем самыя цікавыя і арыгінальныя афармленні домаўладанняў. Ну а ёлку ўпрыгожваем талакой: устанаўлівае навагодняе дрэва ўчастак ЖКГ, а вось упрыгажэнні рыхтуе дзіцячая школа мастацтваў. Іх вырабы хэнд-мэйд, даволі вялікія, аб'ёмныя, заўсёды змястоўныя, часам незвычайныя, будуць радаваць нашых жыхароў усе святы».

У Целяханах Івацэвіцкага раёна на эксклюзіўнае само навагодняе дрэва. Гэтым разам майстры ўчастка ЖКГ прывезлі з лесу жывую вялікую елку. Выкарчавалі яе з максімальным захаваннем каранёвай сістэмы і пасадзілі каля Дома культуры. Прыклад падгледзелі ў мясцовай царкве — некалькі гадоў таму святар разам з вернікамі пасадзіў ёлку ў двары храма, а цяпер яе толькі прыбіраюць да Каляд. «Такім чынам і дрэвы захоўваюцца, ды і з пахам жывой яліны ніякая пластыкавая ёлка блізка не параўнаецца», — заўважыла **кіраўнік спраў Целяханскага сельвыканкама Алена КАЙЛЬ.**

Рыхтуецца да свята Косаўскі замак, які правільна называецца «Палацава-паркавы комплекс». У адной з рэстаўраваных зал не так даўно пачаў работу музей. А перад самым святам наведвальнікаў прымуць гасцініца і рэстаран-бар. Так што сустрэць Новы год у будынку старадаўняга палаца становіцца цалкам рэальна.

Варта нагадаць, што менавіта на Брэстчыне жыве беларускі Дзед Мароз. У сваёй пушчанскай рэзідэнцыі разам са світай казачны Дзед поўным ходам прымае гасцей. Ён жа дазваляе «пропуск» Новага года праз дзяржаўную граніцу. Сёлета беларускія вартавыя граніцы таксама правядуць урачысты рытуал пастаноўкі загаду на «пропуск» 2020 года. Да яго застаецца менш за месяц.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**


Пасёлак Белавежскі.

## «ЁЛКА Ў ЕЛЦЫ»

**Проста з Паўночнага полюса, карыстаючыся бязвізавым рэжымам у Гродзенскай вобласці, Дзед Мароз і Снягурка прыбудуць у суботу на свята ў аграгарадок Елка, што ў Зэльвенскім раёне.**

Казачныя персанажы і сям'я Марозавых з Гродна запаляць на ёлцы навагоднія агеньчыкі. Гасцей чакаюць выстаўка ёлак, катанне на карэце і «ёлкіны забаўкі». А таксама факельнае шэсце, фаершоу і адкрыццё рэзідэнцыі Дзеда Мароза.

Усе ахвотныя змогуць скарыстацца навагодняй поштай і набыць брэндавы сімвал свята — сувенір-брошку «Ёлка». А асаблівыя сюрпрызы чакаюць шчаслівую з навагоднімі прозвішчамі накшталт Марозавых, Ёлкіных, Шаравых, Сняжыцкіх, Зоркавых ды іншых.

**Ірына СІДАРОК.**

# Зоны спаўнення жаданняў,

## або Па слядах Дзеда Мароза

**Да навагодніх свят у краіне запланавана больш за 16,5 тысячы розных мерапрыемстваў у сферы гандлю. З 16 снежня ў сталіцы і рэгіёнах Беларусі пачне работу больш за 1,1 тысячы ёлачных кірмашоў. Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Міхаіл ЖЫГАЛА.**

— У перадсвяточныя і святочныя дні па ўсёй краіне будуць падоўжаныя рэжымы работы гандлёвых аб'ектаў (больш за 800), аб'ектаў грамадскага харчавання (прыблізна 500) і сферы паслуг. Суб'екты гандлю цяпер узгадняюць і фарміруюць з вытворцамі асартымент тавараў з каляднай і навагодняй тэматыкай, падарункаў, сувеніраў і ёлачных упрыгажэнняў. Кандытарскія фабрыкі, якія ўваходзяць у склад канцэрна «Белдзяржхарчпрам», да канца года вырабяць 2,1 мільёна салодкіх навагодніх падарункаў. Пакупнікам прапануюць да 50 найменняў кандытарскіх прысмакаў айчыннай вытворчасці вагой ад 300 грамаў да трох кілаграмаў. Дарэчы, фабрыкі «Камунарка» і «Спартак» ужо паставілі прыкладна 400 тысяч навагодніх падарункаў, — расказаў спікер.

Ён зазначыў, што ў снежні ў сталіцы плануецца прадаць каля мільёна бутэлек шампанскага. Асартымент яго, а таксама ігрыстых вінаў айчыннай вытворчасці ў крамах налічвае каля 40 найменняў рознай ёмістасці.

У пачатку месяца ў Мінску ўпершыню прайшоў аўкцыён, на якім прадаўцы змаглі арандаваць пляцоўкі пад ёлачныя кірмашы тэрмінам на тры гады. Пра гэта расказаў **начальнік Галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Аляксей РАМАНАЎ.**

— Усяго на аўкцыёне было выстаўлена 82 пляцоўкі пад кірмашы, якія будуць працаваць з 22 да 31 снежня. Летась самыя дарагія ёлкі ў сярэднім каштавалі 35 рублёў. Самымі папулярныя былі дрэвы вышынёй ад метра да двух, што прадаваліся прыкладна за 21 рубель. Сёлета цана галоўнага атрыбута Новага года значна не адрозніцца ад папярэдняга, мінімальная для натуральнага дрэва складзе амаль каля 6 рублёў, — упэўніў Аляксей Раманаў.

З 14 снежня на пляцоўцы каля Палаца спорту і Кастрычніцкай плошчы адбудзецца маштабны «Калядны кірмаш», ён прадоўжыцца да 15 студзеня. Рэжым работы наступны: з 14 снежня да 7 студзеня — з 12 да 23 гадзін, з 8 студзеня да 15 студзеня — з 12 да 20 гадзін. Кірмаш будзе працаваць і ў навагоднюю ноч да 4 гадзін раніцы. У гандлёвых пунктах наведвальнікі змогуць пакаштаваць дранікі і бліны з рознымі начынкамі, бургеры і хот-догі, венгерскія калачы, стравы беларуска-літоўскай кухні, шашлыкі і закускі на мангале, мяса з тандыра, а таксама гарачыя напоі.

22 снежня апоўдні ўпершыню пачне работу святочны кірмаш «Мяцеліца», што з'явіцца на пляцоўцы каля Камароўскага рынку. У 24 доміках будуць прадаваць гарачую вулічную ежу, прысмакі, экапрадукты, глінтвейн і збіцень. Завітаць на кірмаш можна будзе штодня з 12 да 22 гадзін, у навагоднюю ноч — да 6 гадзін раніцы 1 студзеня.

Аляксей Раманаў звярнуў увагу і на тое, што ў буйных гандлёвых аб'ектах сталіцы пакупнікам прапануецца да трох тысяч назваў ёлачных упрыгажэнняў і сувеніраў, падарункаў і іншай святочнай атрыбутыкі. Запланаваны шматлікія перадновагоднія акцыі, распродажы, зніжкі:

— Сёлета мы плануем прадаць каля 120 тысяч навагодніх упрыгажэнняў. Асаблівым попытам у пакупнікоў карыстаюцца навагоднія вянкі і шкляныя шары. Ва ўнівермагах Мінска ўжо прадстаўлена больш за сто найменняў навагодніх штучных дрэў, а таксама больш за сто відаў карнавальных касцюмаў коштам ад 10 да 75 рублёў. Напрыклад, у холе сталічнага ГУМа для пакупнікоў падрыхтавана фішка — ручны роспіс шкляных шароў. Іх можна замовіць з любімі надпісамі, пейзажамі або сямейнымі сімваламі і аформіць цацку за некалькі хвілін у стыльную крафтавую ўпакоўку. Па-новаму ў гэтым сезоне ўпрыгожаны і фасад універмага, прылаўкі, паліцы і стэлажы. Традыцыйна пад Новы год у памяшканні «вырастала» ёлка, аднак сёлета яе не будзе. Замест гэтага ў цэнтры залы з'явілася спецыяльная зона са слядамі Дзеда Мароза, якая прызначана для загадвання жаданняў.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

# ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09.
Продавец: **ООО «БелДрев»** (УНП 500541442) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Капитал Диалог», тел. +37529 130-85-30.
Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **9 января 2019 г. 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27. Прием заявок и задатков по 08.01.2020 г. 17.00.

| № п/п | Наименование, местонахождение | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Здание специализированное розничной торговли (капитальное строение, с инв. № 240/С-31170 (административно-торговое здание), общей площадью 1294,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Виссариона Белинского, д. 4, асфальтобетонное покрытие площадью 8450 кв. м. Площадка (материал – бетонная плитка, площадь – 845 кв. м) с бортовым камнем (материал – бетон, протяженность – 298 п. м). Ограждение (материал-металлическое, высота – 1,0 м, протяженность – 200 п. м), теплосеть (материал – сталь, диаметр – 100 мм, 2 трубы, способ прокладки – подземный, глубина прокладки – 1,0 м, протяженность – 171,5 м), электросеть (кабель АСБ 3*35, способ прокладки – подземный, протяженность – 235 м), водопровод (материал – сталь, диаметр – 100 мм, способ прокладки – подземный, глубина прокладки – 2 м, протяженность – 45,6 м), канализация бытовая (материал – чугун, диаметр – 100 мм, способ прокладки – подземный, глубина прокладки – 1м, протяженность – 43,9 м) | 1 192 490,00 |
| 2 | Автомат, сверлильный станок FM 400 Morbidelli, инв. № 485 | 13 200,00 |
| 3 | Вакуумный облицовочный пресс ПО-2500, инв. № 479 | 4100,00 |
| 4 | Вертикальная моечная машина « Bavelloni» LV1604/20DX, инв. № 474 | 20 400,00 |
| 5 | Деревообрабатывающий центр с ЧПУ MORBIDELLI AUTHOR 660. модель U660, инв. № 313 | 35 200,00 |
| 6 | Деревообрабатывающий центр с ЧПУ MORBIDELLI AUTOR 500, инв. № 300 | 32 500,00 |
| 7 | Деревообрабатывающий центр MORBIDELLI AUTOR 504 мод. А 504, инв. № 32 | 24 400,00 |
| 8 | Деревообрабатывающий центр MORBIDELLI AUTHOR660, инв. № 2630 | 35 200,00 |
| 9 | Краскоструйный промышленный принтер для печати на текстильных и прочих издел.DURST RHO P10-200, инв. № 2506 | 139 200,00 |
| 10 | Пескоструйный автомат «Fratelli Rezza» MISTRAL 120V, инв. № 472 | 21 300,00 |
| 11 | Станок для изготовления прямолинейного фацета на стекле, инв. № 5014 | 24 900,00 |
| 12 | Станок изготовления прямолинейной кромки «Bavelloni» тип»GEMY 8», инв. № 473 | 25 800,00 |
| 13 | Станок сверлильный для изг. отверстий (пазов) под петлии их устан. в меб. уст., инв. № 899 | 4700,00 |
| | **Местонахождение** – г. Гродно, ул. Карского, 2А | |

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **24 декабря 2019 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27. Прием заявок и задатков по 23.12.2019 г. 17.00.

| № п/п | Наименование, местонахождение | Начальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 400/С-1104 (проходная) общей площадью 20,1 кв. м, капитальное строение с инв. № 400/С-57475 (административно-бытовой и производственный комплекс) общей площадью 3059,80 кв. м, капитальное строение с инв. № 400/С-60762 (склад листовых материалов) общей площадью 234,9 кв. м, г. Гродно, ул. Карского, д. 2А | 772 650,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 400/С-49752 (административное здание) общей площадью 432,2 кв. м, объект недвижимости – в составе капитального строения с инв. № 400/С-28567 (проходная) общей площадью 15,2 кв. м, г. Гродно, ул. Озерское шоссе, д. 22 | 138 470,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. №400/С-88717 (производственный корпус с хозяйственным бытовым блоком) общей площадью 3745,4 кв. м, г. Гродно, ул. Карского, д. 2А/1, стол гидравлический СПГ 2700*2000, инв. № 2350, стол гидравлический СПГ 2700*2000, инв. № 2254 | 873 130,00 |
| 4 | Капитальное строение с инв. № 300/С-2176 (здание шликерного отделения и участка нестандартного оборудования), общей площадью 1925,5 кв. м; капитальное строение с инв. № 350/С-143227 (водопроводная сеть); капитальное строение с инв. № 350/С-143234 (дождевая канализационная сеть), г. Гомель, ул. Барыкина, 132 | 107 972,50 |
| 5 | Пила диск. д\распила древесины и древесных плит – авт. 6\у HOLZMA HPL11, № 477, 1999 г. в. | 20 090,00 |
| 6 | Станок форматно-раскроечный HOLZMA OPTIMAT HPP 82/43 для раскр. древ. плит, № 159, 2001 г. в. | 24 080,00 |
| 7 | Стол резки стекла Intermac Fox Shape 3700, № 5017, 2001 г. в. | 24 290,00 |
| 8 | Станок для изготовления двухконечной пружины Spuhl AM-115, инв. № 3025,1984 г. в. | 8610,00 |
| 9 | Станок с ЧПУ «Standart»DM-1222, инв. № 5016 | 8876,00 |
| 10 | Универсальный кромкооблицовочный станок WT-91 (MFS 503), инв. № 811, 2010 г. в. | 1386,00 |
| 11 | Бетоносмеситель MIX 1302K 700 Вт 130 л. чугун. венец, инв. № 622 | 112,00 |
| 12 | Пресс мембранный для облицовки мебельных фасадов пленкой ПВХ Itallpress Lock-Form SS Air, № 3010, 2002 г. в. | 18 620,00 |
| 13 | Станок для изготовления криволинейной кромки «Bavelloni SB-10», № 115 | 10 850,00 |
| 14 | Печь промышленная эл. для меллирования стекла (для выгибания) PK-VS 1125, инв. № 2244, 2007 г. в. | 4228,00 |
| 15 | Полуприцеп платформа тентовая Schmitz, рег. № А 9449 А-4, 1994 г. в. | 1778,00 |
| 16 | Полуприцеп фургон тентовый Schmitz Cargobull AG S 01, рег. № 0343 В-4, 2007 г. в. | 11 324,60 |
| 17 | Грузовой седельный тягач Volvo TF 12 F рег. № АЕ 0662-4, 1989 г. в. | 1800,00 |
| | **Местонахождение** – г. Гродно, ул. Карского, 2А | |
| 18 | Капитальное строение с инв. № 400/С-7159 (склад культтоваров) общей площадью 982,8 кв. м, г. Гродно, Озерское шоссе, 186 | 117 000,00 |
| 19 | Капитальное строение с инв. № 400/С-7157 (склад хозтоваров) общей площадью 1212,6 кв. м, г. Гродно, Озерское шоссе, 20 | 178 000,00 |
| 20 | Капитальное строение с инв. № 400/С-7096 (склад) общей площадью 1396,3 кв. м, котел стальной твердотопливный бытовой КСТБ-95 (инв. № 905), г. Гродно, Озерское шоссе, 20 | 173 700,00 |

Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 03.10.2019 г., 26.10.2019 г.
Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.
**Для участия в торгах необходимо** в установленный срок: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY;** 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».
Шаг торгов и задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 30 рабочих дней со дня проведения торгов.

# Извещение о проведении повторного аукциона

**Организатор аукциона:** ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703

**Продавец:** ОАО «СПЕЦРЕМОНТ», 220036, г. Минск, Бетонный проезд, 13

**Предмет аукциона**
**Капитальное строение,** расположенное по адресу: г. Минск, пр-д Бетонный, 17

| лот № | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| 1 | **Литер Г 2/к, административное здание** (здание административно-хозяйственное) | 868,5 кв. м | 500/С-5080 |

Составные части и принадлежности: литер а – проезд, литер б – дорожка, литер в – дорожка, литер г – дождеприемный лоток, литер д – бордюр 0,08, литер е – бордюр 0,16

**В состав лота входит иное имущество.** С перечнем имущества, входящего в состав предмета аукциона, можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,2260 га для эксплуатации и обслуживания административного здания

**Начальная цена с НДС 20 %: 744 738,76 белорусского рубля BYN**
**Шаг аукциона: 37 236,94 белорусского рубля BYN**

**Обременения:** частичная аренда. Подробная информация на сайте www.cpo.by

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 18.00. Ответственное лицо: Каминский Павел Иванович, 8029-659-14-39

**Оборудование расположенное по адресу: г. Минск, ул. Машиностроителей, 80**

| Лот № | Инв. номер | Наименование предмета аукциона (бывшее в употреблении) | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2 | 0181 | Резервуар в комплекте металлический | 224,72 | 11,24 |
| 3 | 0180 | Резервуар в комплекте металлический | 224,72 | 11,24 |
| 4 | 3024 | Компрессор СО7Б | 114,75 | 5,74 |
| 5 | 5450 | Станок сверлильный пазовый СВПА-2 | 401,63 | 20,08 |
| 6 | 5004 | Станок фрезерный ФСША1 | 525,94 | 26,30 |
| 7 | 2582 | Растворонасос СО 49 | 129,09 | 6,45 |
| 8 | 6768 | Агрегат штукатурно-малярный СО-154А | 420,75 | 21,04 |
| 9 | 6765 | Смеситель для раствора и бетона СБ-1.00.000 | 105,19 | 5,26 |
| 10 | 6764 | Смеситель для раствора и бетона СБ-1.00.000 | 105,19 | 5,26 |
| 11 | 6569 | Аппарат высокого давления К-750 | 234,28 | 11,71 |
| 12 | 5000 | Станок заточный 3К 634 | 141,60 | 7,08 |
| 13 | 5020 | Сварочный полуавтомат 40-170А | 86,06 | 4,30 |
| 14 | 000А5084 | Биотуалет (б/у) | 113,40 | 5,67 |
| 15 | 5001 | Станок вертикально-сверлильный МН18Н | 1 050,00 | 52,50 |
| 16 | 21649 | Полуавтомат сварочный ПДГО-510 | 81,28 | 4,06 |
| 17 | 21771 | Станция насосная, сер.№ 050536 | 717,19 | 35,85 |
| 18 | 21529 | Дефектоскоп магнитопорошковый ПМД-70 | 432,00 | 21,60 |
| 19 | 21528 | Дефектоскоп магнитопорошковый ПМД-70 | 432,00 | 21,60 |
| 20 | 21527 | Дефектоскоп у/з УД4 Т | 648,00 | 32,40 |
| 21 | 21635 | Камера сушильная КС 0,25/5,0-400 | 336,00 | 16,80 |
| 22 | 21531 | Нутромер НМ-4000 | 240,00 | 12,00 |
| 23 | 5031 | Станок модельный 3Т-634 | 240,00 | 12,00 |
| 24 | 21652 | Шкаф сушильный для р/пленки ШСРП | 192,00 | 9,60 |
| 25 | 21762 | Агрегат сварочный TS300SC/EL400T23OMX3DEV с тележкой СТМ300 | 2 520,00 | 126,00 |
| 26 | 21792 | Агрегат сварочный SOOSC/EL400T230MX3DEY с тележкой СТМ300 | 2 664,00 | 133,20 |
| 27 | 27775 | Станция насосная | 576,00 | 28,80 |
| 28 | 1518 | Пила маятниковая | 231,00 | 11,55 |
| 29 | 21470 | Сварочный полуавтомат ПДГ-503.4 | 756,00 | 37,80 |
| 30 | 21645 | Аппарат сварочный Форсаж-315 | 294,00 | 14,70 |
| 31 | 21642 | Аппарат сварочный Форсаж-315 | 294,00 | 14,70 |
| 32 | 21752 | Выпрямитель для дуг.сварки ВДУ-506СУЗ с подающим механизмом ПДГО-510 УЗ.1 | 504,00 | 25,20 |
| 33 | 6856 | Выпрямитель импортный ПАТОН ВДИ-200М | 36,96 | 1,85 |
| 34 | 00А5086 | Нивелир оптический с компенсатором BAL 32 | 92,40 | 4,62 |
| 35 | 21648 | Полуавтомат сварочный ПДГО-510 | 121,80 | 6,09 |
| 36 | 27776 | Станция насосная | 630,00 | 31,50 |
| 37 | 6498 | Теодолит 4Т30П | 218,40 | 10,92 |
| 38 | 21672 | Теодолит 3Т5КП | 340,20 | 17,01 |
| 39 | 167 | Машина газовой резки НК-12 BETLE портативная | 121,80 | 6,09 |
| 40 | 1387 | Отопительный модуль-котел AF105HE | 2 520,00 | 126,00 |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 18.00, ответственное лицо: Расолько Александр Александрович, тел. 8029-570-21-84

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи – 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** по лоту **№ 1** не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи (если иное не предусмотрено договором купли-продажи). По лотам **№№ 2–40** не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 16.11.2019

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **24.12.2019** в 10.30 по адресу: **г. Минск, Бетонный проезд, 17, ОАО «СПЕЦРЕМОНТ»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **19.12.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.<br>E-mail: auction@cpo.by |

# Извещение о проведении электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Сайт в интернете: **www.cpo.by** |
| **Продавец** | ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, Восточный переулок, 17 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

Предмет электронных торгов: объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Витебская обл., Дубровенский р-н, Малобаховский с/с , 4, 1,9 км севернее, д. Свиряки, в следующем составе:

**Башня водонапорная,** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения), инв. номер **241/С-7052**, составные части и принадлежности: резервуар бак, ствол, технологический колодец. **Башня водонапорная**, (сооружение специализированное водохозяйственного назначения), инв. номер **241/С-7054**, составные части и принадлежности: резервуар бак, ствол. **Дорога асфальтобетонная**, (сооружение специализированное коммунального хозяйства), инв. номер **241/С-7053. Эстрада**, (сооружение специализированное культурно-просветительного и зрелищного назначения), инв. номер **241/С-7055. Бассейн** (сооружение специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения), инв. номер **241/С-7056. Уборная**, (здание специализированное иного назначения), инв. номер **241/С-7057**, общ. пл. **25,5** кв. м. **Овощехранилище**, (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер **241/С-7058**, общ. пл. **35** кв. м, составные части и принадлежности: сход. **Здание склада**, (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер **241/С-7059**, общ. пл. **38,1** кв. м. **Кладовая**, (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), **241/С-7060**, общ. пл. **30,3** кв. м. **Здание склада**, (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер **241/С-7061**, общ. пл. **101,2** кв. м. **Прачечная**, (здание специализированное для бытового обслуживания населения), инв. номер **241/С-7062**, **18,9** кв. м. **Столовая**, (здание специализированное для общественного питания), инв. номер **241/С-7063**, общ. пл. **591,3** кв. м, составные части и принадлежности: три пристройки, навес. **Подсобные помещения**, (здание специализированное иного назначения), инв. номер **241/С-7064**, общ. пл. **11,1** кв. м. **Здание насосной**, (здание специализированное коммунального хозяйства), инв. номер **241/С-7065**, общ. пл. **18,5** кв. м. **Здание насосной**, (здание специализированное коммунального хозяйства), инв. номер **241/С-7066**, общ. пл.**16,6** кв. м. **Здание склада**, (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер **241/С-7067**, общ. пл. **92,9** кв. м. **Баня**, (здание специализированное для бытового обслуживания населения), инв. номер **241/С-7068**, общ. пл. **93,3** кв. м.

**Сведения о земельном участке:** земельный участок с кадастровым номером 222482900001000003, общ. пл. 2,8148 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений пионерского лагеря «Дружба» (участок № 1).
**Ограничения (обременения) прав.** Водоохранная зона водного объекта: река Днепр, площадь 1,5907 га; ручей Табора, площадь 0,7600 га; ручей Табора, площадь 0,3695 га. Прибрежная полоса водного объекта: река Днепр, площадь 0,0946 га. Придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги, площадь 0,1000 га. Охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 В, площадь 0,0330 га

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **132 908,06 белорусского рубля** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | 30 (тридцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета аукциона**

**Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи**

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 4 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов**

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукционов опубликовано в газете «Звязда» 05.11.2019 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | Начало торгов – 18.12.2019 г. в 11.00.<br>Окончание торгов – 18.12.2019 г. в 12.00.<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 17.12.2019 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

**ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует:**

В извещение о проведении электронных торгов по продаже имущества ОАО «МИЛКАВИТА», опубликованном в газете «Звязда» от 06.12.2019, вносится изменение:
«**Начальная цена предмета электронных торгов** составляет 121 979,23 бел. руб. с НДС 20 %»

**Контактные данные: +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by** УНП 191021390

В суд Речицкого района Гомельской области поступило заявление о признании безвестно отсутствующей Малолетник Анны Васильевны 23.01.1983 года рождения, проживавшей по адресу: Гомельская область, Речицкий р-н, аг. Пересвятое, ул. Гродненская, д. 18.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Речицкого района в течение 2 месяцев со дня публикации имеющиеся сведения о Малолетник Анне Васильевне.

**Витебский областной исполнительный комитет уведомляет** о том, что 04.12.2019 года состоялось заседание конкурсной комиссии по выбору исполнителей отдельных мероприятий подпрограммы 5 «Профилактика ВИЧ-инфекции» государственной программы «Здоровье народа и демографическая безопасность Республики Беларусь» на 2016–2020 годы. По результатам конкурса исполнителем государственного социального заказа на оказание услуг признано Витебское городское отделение Белорусского общественного объединения «Позитивное движение».
УНП 300290538

# ЯК НА ВАЛГАГРАДСКАЙ ЛЯМПАЧКІ МЯНЯЛІ

## А ліхтары — цьмяныя

Увагу на праблему звярнуў ужо добра знаёмы па папярэдніх публікацыях старшыня мікразоны Віталь Гардзееў. У розны час мы з прынцыповым актывістам змагаліся за дарожнае пакрыццё на вуліцы Краснадарскай, супраць сметніка на тэрыторыі тутэйшай установы адукацыі — на сёння ўсе недахопы ліквідаваныя. І вось Віталь Гардзееў зноў патэлефанаваў у газету. Запэўніў, што ўжо скарыстаўся ўсімі іншымі спосабамі дамагчыся праўды.

— Адно спадзяванне на вас, — кажа ён. — Калі б гэта было лета, мы магчыма, не сталі б так рашуча дзейнічаць. Але ж за дзяцей страшна, якія па змрочных вуліцах дамоў ідуць. Цяпер жа пасля пяці ўжо цёмна. Я не кажу пра тых, хто па абавязку службы вяртаецца з начной змены. Тут наогул толькі ўласны ліхтарык і выручае.

Сапраўды, зімовы дзень кароткі, а па вуліцах прыватнага сектара гуляць у цемры вельмі небяспечна. Самі разумееце, нават у горадзе гэта амаль што вёска, дзе рэдка сустрэнеш тратуары. Вуліца Валгаградская — не выключэнне. Нашым чытачам яна ўжо крыху знаёмая: некалькі гадоў таму актывіст прыводзіў нас сюды паказаць архаічныя драўляныя светлавыя апоры. Трэба адзначыць, што прыемныя змены ўсё ж такі адбыліся. Замест драўляных слупоў стаяць новыя — жалезабетонныя. Незадаволенасць выклікае толькі тое, што свяцільні на іх праз адну. Навошта пустыя слупы — незразумела. Жыхары таксама не ў курсе. Толькі смяюцца, маўляў, камунальнікі падрыхтавалі запасныя на той выпадак, калі першыя выйдуць са строю. Затое праблем з асвятленнем спачатку не было. Апоры амаль у два разы вышэйшыя за драўляныя, лямпачкі на іх святлодыёдныя — свецяць яскрава і далёка. Але радаваліся нядоўга.

— У чэрвені была навальніца, і ўсе ліхтары пагаслі, — уздыхае Віталь Фёдаравіч. — Кіраўнік прадпрыемства «Гарсвятло» супакоіў, што яны ўсё адрамантуюць і мы зноў будзем са святлом. Але праз месяц сказалі, што адрамантаваць не атрымалася, і лямпачкі часткова замянілі іншымі — цьмянымі.


Машыны не звяртаюць на Гардзеева ўвагі, ім патрэбен святлафор.

## Лыжка дзёгцю

Цалкам выправіць сітуацыю ніхто не спяшаўся, і Віталь Гардзееў нагадаў аб праблеме на сустрэчы з жыхарамі раёна, дзе акрамя дырэктара прадпрыемства «Гарсвятло» Аляксандра Пашкевіча прысутнічаў яшчэ і кіраўнік адміністрацыі раёна Аляксей Багайчук. Дырэктар камунальнага прадпрыемства даў слова, што праблему вырашыць. Вось толькі калі, не ўдакладніў.

Перапіскі ў Віталя Фёдаравіча — цэлы том: тут і пра дарогі, і пра аптэку, і пра кіёск «Табакерка», і пра пешаходны пераход. Віталь Гардзееў не любіць, калі на яго тэрыторыі няма парадку. Пакуль шукае патрэбныя паперы, дае невялікія каментарыі на іншыя тэмы. Перанесці цыгарэтны кіёск не атрымалася, маўляў, там усё па законе. А вось памяшканне пад аптэку ўсё яшчэ працягваюць шукаць. Найбліжэйшая на чыгуначным вакзале, а гэта некалькі прыпынкаў на тралейбусе.

Нарэшце папера знойдзена. На афіцыйным бланку напісана, што ўчастак дарогі ад Валгаградскай да Адэскай асветліць да 1 кастрычніка. На календары ўжо снежань, а камунальнікі маўчаць. Людзей такія адносіны толькі раздражняюць. І яны не саромеюцца пра гэта казаць услых.

— Да найбліжэйшай вуліцы Адэскай усяго недзе 125 метраў. Здавалася б, колькі там таго кабелю патрэбна, каб забяспечыць святло, але на прадпрыемстве адказваюць: кабелю няма і грошай на яго таксама, — бядуе старшыня мікразоны. — Вось і атрымліваецца, што мы хоць і не такая аддаленая ўскраіна, а жывём, як у каменным веку. А тыя лямпачкі, што памянялі, ледзь свецяць. Раней у нас былі яскравыя святлодыёдныя, а цяпер нейкія незразумелыя. Для іх гэтыя жалезабетонныя слупы занадта высокія. Лямпачка гарыць, але ад яе ніякай карысці.



Людзі скардзяцца, што няма святла, а ім адказваюць, што ёсць.

Прынцыповы старшыня мікразоны ваюе за асвятленне роднай Чапаеўкі ўжо паўгода.

— Засталося шэсць ліхтароў са святлодыёднымі лямпачкамі, астатнія слупы або бяздзейнічаюць, або на іх звычайныя лямпачкі. Усяго на вуліцы прыблізна 14 ліхтароў, — кажа ён.

— Гэта здзек нейкі, — не хавае свайго гневу тутэйшая жыхарка, якая пажадала застацца невядомай. — І званілі, і пісалі — ніякай рэакцыі.

— Лямпачкі цьмяныя, нічога не відаць, — абураецца яшчэ адна жанчына. — У пачатку Валгаградскай абавязкова трэба ліхтар паставіць. А тое з лета катавасія цягнецца. Адзін слуп паставілі, і той нахілены. Унучка, сын прыходзяць дадому позна, вакол такая цемра, што забіцца можна.

— Жыву на вуліцы Валгаградскай, працую таксістам, са змены дамоў вяртаюся ў дзве гадзіны ночы. Едзеш, і дарогі не відаць, — абураецца яшчэ адзін жыхар Чапаеўкі Андрэй Барысавіч.

Валерый Навіцкі таксама падтрымлівае свайго суседа. Жыве ён на Адэскай і пакутуе ад той жа праблемы.

— На ўездзе на Валгаградскую хоць вока выкалі, і пры павароце на нашу вуліцу таксама цёмна, — скардзіцца ён. — Здаецца, і ліхтары ёсць, але толку ад іх ніякага. Было нармальна, а з лета невядома што з тымі ліхтарамі адбываецца. Камунальнікі робяць выгляд, што правілі работу, а на самой справе — ні сабе, ні людзям.

— Святлодыёдныя лямпачкі расійскай вытворчасці яркія, іх праз адну апору ставілі, і святла хапала, — кажа Віталь Гардзееў. — Але калі яны згарэлі, нам далі тое, што было ў падменным фондзе. Свяцільнік працуе, але не свеціць.

## Лыжка мёду

Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што Віталь Гардзееў скардзіцца не заўсёды. Калі ёсць за што, можа і падзякаваць. Вось, напрыклад, пакуль мы ішлі па гэтай шматпакутнай Валгаградскай вуліцы, ён столькі кампліментаў нагаварыў дарожна-маставому прадпрыемству (ДМП), што я нават засумнявалася, а навошта тады ліхтары — калі дарога роўная, можна і навобмацак да дому дабрацца. Смяюся, канешне. ДМП сапраўды робіць сваю справу якасна, заўсёды прыемна паглядзець на работу прафесіяналаў.

— Раней на ўездзе на Валгаградскую лужыны былі такія, што не праехаць, — кажа старшыня мікразоны. — ДМП з дапамогай асфальтабетоннай крошкі «прыпадняла» дарогу — і цяпер ніякіх праблем. І за станам дарожнай сеткі сочыць: як толькі ямкі з'яўляюцца, грэйдарам пройдуцца — і ўсё нармальна. Малайцы! Сёлета давялі да ладу вуліцы Адэскую, Філатава і Томскую — апошняя да нашай мікразоны не адносіцца, але ж жыхары вельмі прасілі дапамагчы. Я звярнуўся на прадпрыемства, і там адразу ж адрэагавалі. Нават самі дамаўляліся з упраўленнем капітальнага будаўніцтва наконт асфальтавай крошкі. Абавязкова падзякуйце ад нас дырэктару Андрэю Клімаву, галоўнаму інжынеру Канстанціну Рыжову і супрацоўніцы Вользе Зінкевіч.

— Нельга казаць, што ўлады нічога не робяць. Яны і прыпынак каля дзявятага ліцэя зрабілі як трэба, хоць доўгі час навес знаходзіўся за 25 метраў да таго месца, дзе тармазілі тралейбусы. Цяпер ніякіх прэтэнзій. Але такога, каб заўваг зусім не было, напэўна, ніколі не будзе, — уздыхае Віталь Гардзееў і зноў ажыўляецца. — А ведаеце, яшчэ адна праблема ёсць. Нам трэба святлафор!

Пытанне, дарэчы, да пешаходнага перахода ў раёне ліцэя № 9.

— Там мая дачка аднойчы ледзь пад машыну не трапіла, — перажывае Віталь Фёдаравіч. — Траса ажыўленая, машыны нясуцца, і некаторыя нават хуткасць не збаўляюць. «Ляжачых паліцэйскіх» тут няма, а святлафор ужо некалькі месяцаў ставяць. І ўсё ніяк.

Насупраць крама, дзе гандлююць запчасткамі для аўтамабіляў. Прадавец Яўген старшыню мікразоны падтрымлівае.

— Зрабілі няякасна, — кажа ён пра пераход. — Калі дождж ідзе, яго моцна падтапляе, стаяць лужыны. Тут павінна быць ліўнёўка, але яе проста не сталі рабіць. Спачатку паднялі асфальт, пачалі капаць, а там кабелі. Яны рукой махнулі і зноў закапалі — пакінулі ўсё як ёсць.

Святлафор, напэўна, калі-небудзь з'явіцца, але людзям не падабаецца жыць у стане бясконцага чакання.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### Каментарый у тэму

**Аляксандр ПАШКЕВІЧ, дырэктар магілёўскага гарадскога прадпрыемства «Гарсвятло»:**

— Да 20 снежня мы абавязкова ўстановім свяцільню на апору па вуліцы Валгаградскай. Наогул, асвятленне на гэтай вуліцы зроблена ў адпаведнасці з праектам і існуючымі стандартамі. Сапраўды, першапачаткова былі ўстаноўлены святлодыёды, якія спажывалі шмат электраэнергіі. Узамен мы ставілі энергазберагальныя лямпы, якія прадугледжаны для дваровых тэрыторый і прыватнага сектара, дзе асветленасць павінна быць да 4 люкс, яны нарматыўна забяспечваюць. Канешне, людзям падабалася, калі стаялі свяцільні большай магутнасці, але ж гэта дадатковыя выдаткі — звышнарматыўў. Энергазберагальныя мы ставім па горадзе ўжо пяць гадоў, у краіне існуе праграма па энергазберажэнні, і гэтай праграмай прадугледжаны менавіта вось гэтыя свяцільні — ДБУ. Я абавязкова яшчэ раз пабываю на вуліцы Валгаградскай, але, як сведчаць работнікі прадпрыемства, якія там былі, нарматыў па асветленасці выконваецца. Слупы ўстаноўлены згодна з праектам, гэтым займаліся электрасеткі. Мы ж толькі абслугоўваючая арганізацыя.

Дарэчы, Аляксандр Пашкевіч растлумачыў таксама, чаму свяцільні свецяць не на кожным слупе, а праз адзін.

— На так званыя пустыя слупы накінуты правады, якія забяспечваюць прыватныя дамы электрычнасцю. Іншымі словамі, асноўная лінія забяспечвае электраэнергіяй жылыя дамы. Таму апоры знаходзяцца на адлегласці 35-40 метраў адна ад адной. А нарматыў па нашых свяцільнях 100-120 метраў. Таму яны і вісяць праз апору.

---

## Будзь у курсе!

### «БЧ. Мой цягнік» — на платформах Android і IOS

**Афіцыйная мабільная праграма Беларускай чыгункі «БЧ. Мой цягнік» стала даступная для бясплатнага спампоўвання карыстальнікамі смартфонаў і планшэтаў на платформах Android і iOS, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.**

Дадатковы функцыянал мабільнай праграмы «БЧ. Мой цягнік» і новы раздзел афіцыйнага сайта rw.by «Паслугі пасажырам» даюць магчымасць афармлення электронных білетаў на цягнікі рэгіянальных ліній эканом-класа, гарадскіх ліній, а таксама афармлення перасадачных маршрутаў з аплатай праз адзіны кошык заказаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Ведай нашых!

### «Клімат-кантроль» у бірульцы

**Студэнты БДУ распрацавалі ўпрыгажэнне, прызначанае для маніторынгу навакольнага асяроддзя.**



Аўтарамі ўнікальнага праекта з'яўляюцца магістранты факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій першакурснікі Ігар Чыжоў і Раман Міраноўіч, трэцякурснікі Аляксандр Семяновіч і Максім Кандратовіч, паведамілі ў прэс-службе ўніверсітэта.

«Разумны» аксесуар можа мець любую форму і выкарыстоўвацца як падвеска на ланцужку, пярсцёнак, завушніцы, брошка. Упрыгажэнне ўяўляе сабой друкаваную плату, абсталяваную святлодыёдамі, мікрафонам і датчыкамі. За кошт свячэння дыёдаў прыбор апавяшчае ўладальніка пра павышэнне ці паніжэнне атмасфернага ціску, тэмпературы і вільготнасці паветра. Прылада мігаціць у такт музыцы, якая грае, і ярка свеціцца пры моцных гуках. Выназходства таксама дапамагае сачыць за здароўем, паведамляючы пра змены тэмпературы цела.

У залежнасці ад спецыфікі месца пражывання носьбіта вырабу распрацоўшчыкі могуць дарабіць упрыгажэнне. Для жыхароў прамысловых раёнаў актуальным стане датчык кіслароду, які адрэагуе на павышаны ўзровень забруджвання паветра.

Аўтары праекта прадставяць распрацоўку на Міжнародным конкурсе «Стартап года», які пройдзе 14 снежня ў Мінску. Удзел у ім дазволіць аўтарам прэзентаваць сваю інавацыю з мэтай пошуку патэнцыйных інвестараў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «У мяне часта пытаюцца, як стаць шчаслівай...»



## «Тое, да чаго ты нераўнадушны, мае вялікія шанцы на поспех»

***— Каця, чаму вырашылі стварыць праект менавіта ў інтэрнэце? Раскажыце, з чаго ён пачынаўся.***

— Я скончыла МДІМА і не збіралася вяртацца ў мадэлінг. Мне для душы, для рэалізацыі ўнутраных амбіцый быў неабходны нейкі праект. Шчыра скажу, што было страшна пачынаць штосьці, не маючы досведу ў бізнесе, тым больш у СМІ. І таму я прыйшла да сваёй блізкай сяброўкі Маргарыты Ліевай. Кажу: «Рыта, трэба штосьці рабіць». У яе было такое ж жаданне. Першапачаткова пунктам уваходу для нас абедзвюх стаў праект, які не патрабуе пастаяннай прысутнасці ў нейкай адной геаграфічнай лакацыі. Адпаведна, мы вырашылі, што будзем працаваць у інтэрнэце. Тэмы прыгажосці, здароўя, здаровага спосабу жыцця вельмі лагічныя — гэта тое, што нас цікавіць. І, як правіла, тое, да чаго ты нераўнадушны, мае вялікія шанцы на поспех.

***— Сёння штодзень сайт наведвае 400 тысяч унікальных карыстальнікаў. Рэсурс адразу стаў паспяховым?***

— Яго развіццё не заўсёды было простае. На пачатковым этапе, канешне, у нас не хапала вопыту, правільнага разумення таго, як усё павінна быць выбудавана. Нельга сказаць, што ідэя сайта і яго аблічча нарадзілася ў нейкі канкрэтны дзень, — гэта працэс, які не завяршыўся і сёння. Мы ідзём да вельмі канкрэтнай мэты, якая мае і візуальнае ўвасабленне. Хутка нас чакаюць пэўныя змены, у тым ліку кантэнтныя: мы становімся лепшыя, цікавейшыя, больш узважлівыя, глыбейшыя. Мы сочым за трэндамі на рынку і не даём сабе паслабленняў. З аднаго боку гэта, несумненна, прыносіць задавальненне, з другога — пастаянны выклік, на які трэба адказваць.

Адназначна, былі моманты, калі мне хацелася ўсё кінуць. Думаю, што кожны ўладальнік бізнесу сутыкаецца на пэўным этапе з пунктам выгарання, калі не разумее, для чаго ён гэта робіць і якая канчатковая мэта. У мяне былі такія моманты, і я іх, на шчасце, пераадолела — і сама, і дзякуючы сваёй камандзе, і дзякуючы сваёй партнёрцы Маргарыце. І я рада, што не апусціла рукі, а пайшла далей. Цяпер я задаволена тым, як выглядае праект, і бачу для яго перспектывы.

***— Вы скончылі МДІМА па спецыяльнасці «журналіст-міжнароднік». Памятаеце сваю першую публікацыю?***

— Што датычыцца непасрэдна маёй спецыяльнасці, то такога вопыту ў мяне няма. Мне не давялося напісаць ніводнага артыкула на вострую палітычную тэму ці на тэму міжнародных адносін. І не думаю, што ўсё наперадзе. Усё ж мне больш па душы жыццёвыя тэмы, якія маюць водгук у сэрцах чытачоў. Мая галоўная мэта як заснавальніка СМІ — быць карыснай людзям, дапамагаць, дарыць ім добры настрой. Займаючыся той дзейнасцю, якой займаецца журналіст-міжнароднік, не заўсёды можна ўвасобіць гэтыя памкненні.

***— Якая сёння ваша роля ў праекце? Колькі чалавек над ім працуе?***

— Сёння ў нашым штаце каля 12 чалавек, і, канешне, шмат людзей на аўтсорсінгу. Гэта як аўтары, так і тэхнічныя падрадчыкі. Мая роля ў праекце ў большай ступені ментарская. Гэта пэўная лінія, якую я бачу і якую мы з камандай увасабляем. Зразумела, што ёсць вялікая колькасць бягучых пытанняў. Калі казаць пра размеркаванне абавязкаў паміж мной і Маргарытай, то я ў большай ступені адказваю за тэхнічны бок: узаемадзеянне па пытаннях SEO, SMM, таго ж дызайну. А мая самая галоўная задача — кантакты з галоўным рэдактарам, камандай, нараджэнне новых ідэй, натхненне каманды, кантроль якасці — усё тое, ад чаго я атрымліваю вялікае задавальненне.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



З бацькамі.

***— Вы даволі актыўна ведзяце сваю старонку ў «Інстаграме». Гэта таксама прыносіць задавальненне?***

— Зараз у мяне, дарэчы, перыяд пэўнага зацішша. Для мяне гэта не работа, не штосьці абавязковае. У мяне не пачынаецца паніка, калі я разумею, што некалькі дзён нічога не выкладвала. Часам мне сапраўды патрэбны сур'ёзны адпачынак ад гэтай сацыяльнай сеткі. Але ў большасці выпадкаў яна ўсё ж мяне натхняе. І, несумненна, гэта пляцоўка для кантактавання з маімі падпісчыкамі, я атрымліваю ад гэтага вялікае задавальненне, бо я адчуваю, што з многімі з іх у нас падобныя погляды. На старонцы вельмі станоўчая энергетыка — не толькі дзякуючы таму, што я друкую, але і праз зваротную рэакцыю ад маёй аўдыторыі. У мяне амаль ніколі не бывае негатыўных каментарыяў, усе вельмі пасяброўску настроены адно да аднаго. Гэта падобна на маю дзейнасць з Beautyhack.ru: галоўная мэта — быць карысным. Публікацыі ў «Інстаграме», безумоўна, гэта пэўнае задавальненне нашага эга, славалюбных пачаткаў. Але іншы асноўны парыў, калі я публікую свае гісторыі і пасты, — гэта жаданне быць карысным. І мне здаецца, гэта добра атрымліваецца.

***— Вы адказваеце сваім падпісчыкам, што славутасці робяць нячаста...***

— Вядома, што колькасць аўдыторыі такім чынам павялічваецца, але я раблю гэта не для таго, каб хайпануць на сваёй старонцы ці атрымаць большую колькасць падпісак. Мяне сапраўды цікавіць меркаванне людзей, і ў гэтай сітуацыі не адказаць ім будзе папросту несумленна. Мы ж кантактуем у двухбаковым, а не аднабаковым парадку.

***— Для гэтага праводзіце і сустрэчы з падпісчыкамі? Хвалюецеся, ці запоўніцца зала?***

— У мяне няма вялікага вопыту правядзення сустрэч з падпісчыкамі. Я рабіла такую сустрэчу толькі аднойчы — у Мінску. Канешне, хвалявалася, колькі людзей прыйдзе, ці будзе гэта камусьці цікава. Але, правёўшы яе, я адчуваю, што яна атрымала вялікі водгук у сэрцах людзей. Мне пасля прыходзілі вельмі глыбокія, шчырыя, душэўныя паведамленні, і разуменне таго, што ўсё не дарэмна, са мной засталося.

***— Пра што часцей за ўсё пытаюцца ў вас пры сустрэчах?***

— Наша кантактаванне пабудавана ў фармаце лекцый, калі я больш дзялюся сваім досведам. Пытанні, вядома, задаюць, але ўсе яны з плоскасці таго, як быць прыгожым, як быць шчаслівым, як радавацца жыццю. І вельмі прыемна, што ў людзей я асацыююся менавіта з такімі запытамі.

## «Я навучылася дэлегаваць, у тым ліку і клопат пра дзяцей»

***— Ці ёсць у вас час удзельнічаць у здымках?***

| № лота | Предмет торгов | Место нахождения | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС | Шаг торгов (5 %), бел. руб. | Сумма задатка (5 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | GAZ A22R23, инв. № 145 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 13 944,00 | 697,20 | 697,20 |
| 2 | картофелеуборочный комбайн DR1500 GRIMME 06, инв. № 62 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 29 736,00 | 1486,80 | 1486,80 |
| 3 | трактор «Беларус 82.1», инв. № 130 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 14 448,00 | 722,40 | 722,40 |
| 4 | трактор «Беларус 82.1», инв. № 131 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 16 380, 00 | 819,00 | 819,00 |
| 5 | опрыскиватель 600L 12M, инв. № 138 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 1176, 00 | 58,80 | 58,80 |
| 6 | ПТС-7, инв. № 115 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 2436, 00 | 121,80 | 121,80 |
| 7 | ПКК-1-0100000 измельчитель, инв. № 126 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 924,00 | 46,20 | 46,20 |
| 8 | ПКК 0350000 подборщик, инв. № 148 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 1680, 00 | 84,00 | 84,00 |
| 9 | агрегат АДД-4004 МУ, инв. № 49 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 2436,00 | 121,80 | 121,80 |
| 10 | грабли роторные ГР-700, инв. № 128 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 6384, 00 | 319,20 | 319,20 |
| 11 | машина для формирования гребней MR20, инв. № 7 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 1512, 00 | 75,60 | 75,60 |
| 12 | окучник-культиватор-гребнеобразователь ОКГ-4,0, инв. № 104 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 2016,00 | 100,80 | 100,80 |
| 13 | ПКК-0400000А-01 жатка для трав, инв. № 149 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 5964, 00 | 298,20 | 298,20 |
| 14 | пресс-подборщик рулонный ПР-Ф-180, инв. № 142 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 7560, 00 | 378,00 | 378,00 |
| 15 | пресс-подборщик рулонный ПР-Ф-180, инв. № 141 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 7560, 00 | 378,00 | 378,00 |
| 16 | Лот № 26 в составе:<br>– капитальное строение с инв. № 642/С-12106 (назначение – здание одноквартирного жилого дома) на земельном участке с кадастровым номером 622881304100000001 по адресу: Минская область, Копыльский район, Тимковичский с/с, д. Новоселки, ул. Гриба, 23,<br>– забор бетонный с сеткой металлической | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Гриба, 23 | 5271,53 | 263,58 | 263,58 |
| 17 | Лот № 27 в составе:<br>– капитальное строение с инв. № 642/С-30375 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения) на земельном участке с кадастровым номером 622885003001000205 по адресу: Минская область, Копыльский район, Тимковичский с/с, д. Новоселки,<br>– капитальное строение с инв. № 642/С-11283 (назначение – здание специализированное розничной торговли) на земельном участке с кадастровым номером 622881304101000107 по адресу: Минская область, Копыльский район, Тимковичский с/с, д. Новоселки, ул. Жижика, 68В,<br>– счетчик электрический СЕ102,<br>– забор металлический | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 23 500,45 | 1175,02 | 1175,02 |
| 18 | Полуприцеп самосвальный ПСТ-9 2013 г., инв. № 00000136 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 5964,00 | 298,20 | 298,20 |
| 19 | Полуприцеп самосвальный ПСТ-9 2013 г., инв. № 00000137 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 5964,00 | 298,20 | 298,20 |
| 22 | Косилка КДН -3,1, инв. № 00000105 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 3612, 00 | 180,60 | 180,60 |
| 21 | трактор Беларус 1221В, инв. № 44 | Копыльский район, д. Новоселки, ул. Жижика, 68 | 9744,00 | 487,20 | 487,20 |

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## об аукционе по продаже права заключения договора аренды изолированного помещения, расположенного по ул. Я. Купалы, д. 1, пом. 1 в г. Лида

Балансодержатель объекта: Унитарное коммунальное предприятие «Комбинат школьного питания» г. Лида, Южный городок, 11А; УНП 500011105; тел. 8 0154 648129; форма собственности: государственная (коммунальная)

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь (кв. м) | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Коэффициент, устанавливаемый Арендодателем | Условия аукциона | Характеристика объекта | Инженерная и транспортная инфраструктура | Способ сдачи в аренду (прямой договор аренды или путем проведения аукциона) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Право заключения договора аренды изолированного нежилого помещения ресторана «Ноктюрн» на 3 года | Гродненская область, г. Лида, ул. Я. Купалы, д. 1, пом. 1 | 417, 6 | 1764, 36 | 176,44 | 2 | Под объект общественного питания, розничной торговли (за исключением одежды и обуви, бывших в употреблении), административные цели (офис), оказание услуг (кроме ритуальных услуг) | Изолированное нежилое помещение. Помещение на первом этаже в здании ГУ «Дворец культуры города Лиды» ресторан «Ноктюрн» с двумя отдельными входами, одной загрузочной рампой | Коммуникации имеются (отопление, водоснабжение, электроснабжение). Требуется откачка сточных вод из колодцев (кратность зависит от вида деятельности, погодных условий) | Аукцион |

1. Аукцион состоится: 09.01.2020 г. в 14.00 по адресу: Гродненская обл., г. Лида, ул. Южный городок, 11А.
2. Организатор аукциона, продавец: Унитарное коммунальное предприятие «Комбинат школьного питания» г. Лида, Гродненская область, г. Лида, ул. Южный городок, 11А.
3. Победителем аукциона признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан оплатить стоимость предмета аукциона за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. В случае отказа или уклонения победителя аукциона (лица, приравненного к победителю аукциона) от оплаты стоимости предмета аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, подписания протокола аукциона, договора аренды внесенный им задаток возврату не подлежит.
4. Участники аукциона уплачивают штраф в размере 1000 (одна тысяча) белорусских рублей в случаях, предусмотренных частью второй пункта 14 Положения о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утв. постановлением Совета Министров Республики Беларусь 0808.2009 №1049. Штраф подлежит уплате в течение одного месяца со дня проведения аукциона, внесенный задаток возврату не подлежит.
5. Объект предоставляется с условиями:
– заключения договоров с обслуживающей организацией на откачку сточных вод из канализационных колодцев, на вывоз мусора, согласования внешнего вида объекта с отделом архитектуры и строительства Лидского райисполкома, Арендодателем;
– заключение договора с обслуживающей организацией на уборку прилегающей территории либо иным способом организовать уборку прилегающей территории.
6. Договор аренды недвижимого имущества заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.
7. Документы для участия в аукционе принимаются по адресу: Гродненская область, г. Лида, Южный городок, 11А, в рабочие дни с 8.00 до 16.30, кабинет «Юрисконсульт». Начало приема документов – 09.12.2019. Последний день подачи документов по аукциону – 08.01.2020 г. до 16.30.
8. Сумма задатка по аукциону перечисляется на расчетный счет № BY70 AKBB 3012 1110 5001 6420 0000 филиал № 413 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21413, УНП 500011105.
9. Контактный телефон для уточнения и получения дополнительной информации (8-154) 648129. ИНТЕРНЕТ-САЙТ: KSHPLIDA.WWW.BY, раздел «Информация».

## Бенджамін-Павел ДУДУ:

# «У ГАНЕ МЯНЕ НАЗЫВАЛІ БЕЛЫМ»

### Беларус, якога на радзіме часцей прымаюць за замежніка, расказвае пра жыццё ў Афрыцы і сваю баскетбольную кар'еру

**Цяпер Бенджамін-Павел Дуду — баскетбаліст магілёўскага «Барысфена». Яго нетыповае імя тлумачыцца паходжаннем: мама Бена — беларуска, тата — ураджэнец Ганы. Пасля нараджэння першынца сям'я Дуду пераехала ў Гану, але праз пяць гадоў Бенджамін разам з мамай і сястрой вярнуўся ў Беларусь. У Светлагорску ён пачаў займацца баскетболам, неўзабаве перспектыўнага юнага гульца заўважылі селекцыянеры з Расіі і прапанавалі паспрабаваць свае сілы там.**




У 14 гадоў хлопец самастойна пераехаў у Піцер, пасля чаго прабіўся ў адзін з наймацнейшых баскетбольных клубаў Расіі — падмаскоўныя «Хімкі». У сезоне 2013/2014 Дуду ў складзе маладзёжнай каманды «Хімак» стаў чэмпіёнам Адзінай маладзёжнай Лігі ВТБ, а таксама сыграў за маладзёжную зборную Расіі. У 2014 годзе ён перайшоў у маскоўскае «Дынама», дзе разам з камандай выйграў бронзавыя медалі Суперлігі і стаў фіналістам Кубка Расіі. А тры гады таму вырашыў зноў вярнуцца на радзіму. Увосень Бенджамін нарэшце вярнуў сабе беларускае спартыўнае грамадзянства і перастаў лічыцца легіянерам, разам з тым ён атрымаў магчымасць згуляць за нацыянальную зборную Беларусі.




***— Як вас часцей называюць — Бенджамін або Павел?***

— Маё поўнае імя Бенджамін-Павел-Ніі-Апонса, але ўсё яно, мабыць, проста не ўлезла ў пашпарт *(смяецца)*. Бенджамінам мяне назваў бацька, гэта перакладаецца як «любімы сын», Паўлам — мама, у гонар свайго бацькі. Ніі — хлопчык каралеўскага роду племя Га, Апонса абазначае хлопчыка, народжанага ў сям'і ці шостым, ці дзявятым па ліку, але паколькі цяпер шмат дзяцей не нараджаюць, гэтае імя мне купілі. Яшчэ ёсць неафіцыйнае дамашняе імя — Коджо, перакладаецца як «хлопчык, народжаны ў панядзелак». У Гане прынята даваць такія дадатковыя імёны.

У Беларусі часцей за ўсё мяне завуць проста Бен, а Паўлам клічуць толькі дома, часцей за ўсё старэйшае пакаленне радні. На самай справе для мяне гэта не мае значэння, хоць на Паўла я магу зрэагаваць не адразу *(усміхаецца)*.

***— Як пазнаёміліся вашы бацькі?***

— Мама вучылася ў Віцебску, бацька там жа ў медыцынскім універсітэце па абмене. Ён добра, хоць і з невялікім акцэнтам, размаўляў на рускай мове. У Беларусі яны пажаніліся, з'явіўся я, але потым бацькі вырашылі пераехаць у Гану, таму што тату прапанавалі работу галоўнага ўрача. У той час замежная адукацыя вельмі цанілася, ды і ў цэлым прафесія ўрача была вельмі прэстыжная, таму што ад спякоты і антысанітарыі ў Афрыцы вельмі шмат хвароб.

**«Адчуваю сябе беларусам, таму што ўсё свядомае жыццё пражыў тут, вучыўся ў школе, упершыню прыйшоў у баскетбольную секцыю».**

***— Што вы памятаеце са свайго дзяцінства ў Гане?***

— Мы прыехалі туды, калі мне быў год, у тры я пачаў хадзіць у школу, гэта нармальная практыка для ўсіх мясцовых дзяцей. Мы вучылі алфавіт, лічбы, напэўна, гэта больш падобна на наш дзіцячы сад. Добра запомнілася тое, што пілі ваду з цэлафанавых пакетаў, таму што з пластыкам там былі праблемы. Мы з бацькамі жылі ў аднапавярховым доме, у Гане заўсёды вельмі горача, таму ў хаце быў кандыцыянер. Кожную раніцу бацька хадзіў і выкідваў змей з-пад балкона, таму што ўсе яны сцягваліся да вільгаці і холаду. Можа, нават адтуль у мяне з'явілася вялізная боязь змей — баюся нават тых, з якімі прапануюць сфатаграфавацца ў парку. Неяк пабачыў яе за метр ад сябе — думаў, страчу прытомнасць. Мама расказвала, што ў Гане сутыкалася з адзінай цяжкасцю — адсутнасцю малочных прадуктаў, але існавалі і свае перавагі, напрыклад, садавіна, якую нельга было ў той час знайсці ў Беларусі.

***— На якой мове вы размаўлялі ў Гане?***

— На англійскай, хоць там шмат мясцовых моў, дыялектаў. Мама казала, што вывучыць іх вельмі складана. Рускай у дзяцінстве я яшчэ не ведаў, мая першая мова — англійская. Калі мы вярнуліся ў Беларусь, паўстала праблема са школай, тады ж не было спецыялізаваных устаноў, дзе ўсе прадметы выкладаюць на англійскай. Праз гэта я правёў лішні год у садку, дзе мяне мэтанакіравана вучылі рускай мове. Мама ўсім проста забараніла размаўляць са мной на англійскай.

У Гане я вылучаўся, там мяне называлі белым, таму што я быў самы светлы. Для іх гэта было ў навіну, тады там сустракалася мала еўрапейцаў. А калі мы вярнуліся ў Светлагорск, для мясцовых, наадварот, я здаваўся ўжо занадта цёмны.

***— Пасля пераезду ў Беларусь на радзіму бацькі вы не вярталіся?***

— Не, хоць ведаю, што сваякі запрашалі, але яны самі раз'ехаліся — хто ў ЗША, хто ў Англію. У сваякоў пад Лонданам гасцявала мая сястра, там ёсць раён, дзе пасялілася шмат ураджэнцаў Ганы, яна мела зносіны з імі, хадзіла ў мясцовую царкву і сказала, што гэта зусім іншы свет, вельмі цікавы.

***— Адаптавацца ў Светлагорску пасля афрыканскай краіны было складана?***

— Не надта гэта памятаю, але мама казала, што дзеці былі ў шоку, бо яны ледзь размаўлялі на рускай, а я на англійскай, яна часам была перакладчыкам паміж намі. Канфліктаў з-за колеру скуры не было, яны з'явіліся са сталеннем. Калі кудысьці выходжу, вядома, можна пачуць шмат чаго ў свой адрас, але я стараюся абстрагавацца, не рэагаваць на абразы: калі людзям так лягчэй, то калі ласка.

***— У Беларусі вас часта прымаюць за замежніка?***

— Так, асабліва калі я маўчу. Да мяне спрабуюць звярнуцца на ламанай англійскай, а калі я адказваю на рускай, узнікае невялікі шок. Бываюць такія кур'ёзы, гэта нармальна, я і сам з гэтага смяюся. Адчуваю сябе беларусам, таму што ўсё свядомае жыццё пражыў тут, вучыўся ў школе, упершыню прыйшоў у баскетбольную секцыю.

***— Раскажыце пра перыяд жыцця ў Расіі, куды вы пераехалі ў досыць юным узросце.***

**«Мама ўсім проста забараніла размаўляць са мной на англійскай».**

— Мне было 14 гадоў, на той момант у Расію часта запрашалі беларускіх хлопцаў, да мяне ўжо з'ехала пару чалавек. Напэўна, заўважылі мяне як перспектыўнага на нейкім міжнародным турніры. Выйшлі на маму, прапанавалі пераехаць у школу-інтэрнат у Санкт-Пецярбург. На той момант мы думалі, што так будзе лепш, напэўна, яно на самай справе так і атрымалася. Калі б я не пераехаў, то не быў бы цяпер тым, хто я ёсць. Пасля Піцера мяне запрасілі ў «Хімкі», там правёў дзевяць гадоў, пачынаючы з самага нізу, дайшоў да галоўнай каманды. У асноўнай камандзе атрымліваў няшмат гульнявога часу, таму пачаў разглядаць іншыя варыянты. З часам перайшоў у маскоўскае «Дынама», але клуб закрыўся з-за фінансавых праблем, потым былі каманда ў Яраслаўлі і клуб пад Краснадарам. Самым яркім момантам з гэтага перыяду кар'еры, мабыць, была гульня ў асноўнай камандзе «Хімак». Для мяне гэта было штосьці незвычайнае, таму што тады там ужо гулялі майстры сусветнага ўзроўню, якія выступалі за нацыянальныя зборныя сваіх краін, хтосьці раней гуляў у наймацнейшай лізе — NBA. Ад іх хуткасцяў і шпаркасці мыслення на трэніроўках спачатку кружылася галава, дзесьці не паспяваў разумець, але глядзеў, вучыўся і з часам уцягнуўся. Гэта быў вельмі добры вопыт.

***— Якія варыянты працягу кар'еры ўзнікалі пасля Краснадара?***

— З'явілася пару варыянтаў у Расіі, але гэта было далёка тэрытарыяльна, па сямейных абставінах я шукаў штосьці-небудзь бліжэйшае да хаты. Пазней сябар паклікаў мяне ў Магілёў, сказаў, што тут змяняецца кіраўніцтва, будзе новы трэнер — Андрэй Крыванос. Даў мне яго нумар тэлефона, мы пагутарылі, і гэта аказаўся ідэальны варыянт. Так атрымалася, што ў «Барысфене» я ўжо трэці год. Клуб пачаў развівацца, сёлета мы заявіліся ў Еўракубак і Еўразійскую лігу. Гэта даволі добрыя турніры, у якіх можна і пагуляць, і атрымаць вопыт.

***— На той момант вяртанне ў беларускі клуб — гэта крок назад у вашай кар'еры?***

— Многія сябры з Расіі ставіліся скептычна, казалі, маўляў, чэмпіянат Беларусі — гэта што наогул? І больш настройвалі мяне на тое, каб застацца ў Расіі. А цяпер яны здзіўлены. Не думалі, што такога ўзроўню спаборніцтвы будуць праходзіць тут. Сам я таксама не шкадую, што прыняў тады такое рашэнне.

***— Наколькі папулярны ў Магілёве баскетбол?***

— Са з'яўленнем у клубе PR-менеджара на гульні пачало прыходзіць значна больш людзей, з'явіліся шоу-праграма, дыджэй, група падтрымкі, конкурсы ў перапынках, забаўкі для дзяцей. Наколькі я ведаю, у нас самая высокая наведвальнасць у чэмпіянаце Беларусі, на рэйтынгавыя гульні прыходзіць каля 850 чалавек, на фінале было каля тысячы балельшчыкаў.

***— Нядаўна ФІБА афіцыйна дазволіла вам гуляць за зборную Беларусі...***

— Гульцы, якія не маюць права выступаць за нацыянальную зборную, лічацца на пляцоўцы легіянерамі, калі гуляюць за клуб, хоць і нарадзіліся ў Беларусі. Такое рашэнне ў першую чаргу дазволіла мне мець больш гульнявога часу. Калі раней у сярэднім я праводзіў на пляцоўцы 4—5 хвілін, то цяпер 16—18, а з самымі моцнымі сапернікамі наогул каля 36 хвілін. Да таго ж я з задавальненнем бы пагуляў за зборную Беларусі.

***— Пра што вы марыце ў спартыўным плане?***

— Хацелася б трапіць у нацыянальную зборную, раз з'явілася такая магчымасць, і з ёй выступаць не толькі ў адборачных этапах, якія праходзяць на чэмпіянатах Еўропы, свету і Алімпійскіх гульнях. Што датычыцца клуба, то, вядома, хацелася б выйграць чэмпіянат, а таксама кубак краіны, ды і на еўрапейскай арэне не проста гуляць адбор, але і паўнавартасна ўдзельнічаць у групавых этапах, таму што гэта зусім іншы баскетбол.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
**Фота прэс-службы БК «Барысфен».**
*Мінск — Магілёў — Мінск.*

# У БАГДАДЗЕ НЕСПАКОЙНА



## Чаму палае Ірак?

Навіны з Ірака цягам апошніх некалькіх месяцаў вельмі нагадваюць зводкі вайсковых дзеянняў. Днямі стала вядома, што размешчаная на захад ад Багдада (у правінцыі Анбар) ваенная база, на якой дыслакаваныя амерыканскія фарміраванні, трапіла пад ракетны абстрэл. Пра гэта паведаміў тэлеканал As Sumariya са спасылкай на заяву сілавых структур Ірака. «Пяць ракет упала на тэрыторыі базы Айн аль-Асад», — адзначылі ў праваахоўных органах. Наконт таго, хто менавіта можа стаяць за гэтай атакай, інфармацыі пакуль не паступала. Як вядома, на тэрыторыі Ірака знаходзіцца некалькі ваенных лагераў, у якіх раскватараваны падраздзяленні з ЗША. Апошнім часам іх нярэдка атакуюць. Так, у канцы кастрычніка напад быў здзейснены на базу ў раёне Эт-Таджы на поўнач ад іракскай сталіцы. Гэта адбываецца на фоне жорсткіх масавых пратэстаў, якія працягваюцца вось ужо трэці месяц. Чаму палае шматпакутны Ірак?

## Ахвяры на плошчы Тахрыр

Трыгерам пратэстаў у Іраку выступіла... надвор'е: у першы тыдзень кастрычніка слупок тэрмометра вагаўся паміж 35 і 40 градусамі Цэльсія. У гэтых умовах цяжэй за ўсё мірыцца з праблемамі жыллёва-камунальнай сферы: паломкамі ў водазабеспячэнні і перыядычнымі адключэннямі электрычнасці. Грамадская думка Ірака ўскладае адказнасць за непаладкі на карупцыю. Толькі па афіцыйна прадстаўленых звестках, з 2003 года праз нячыстых на руку чыноўнікаў прайшло 450 мільярдаў долараў, што адпавядае чатыром бюджэтам краіны, перадае tass.ru.

Хоць Ірак з'яўляецца другім па значэнні вытворцам нафты ў АПЕК, значная колькасць людзей жыве ў галечы. Узровень карупцыі — самы высокі на Блізкім Усходзе. Міжнародная арганізацыя Transparency International паставіла краіну ў сусветным індэксе карупцыі на 161-е месца з 168. Яшчэ адзін біч Ірака — беспрацоўе. Чвэрць моладзі ва ўзросце да 25 гадоў не мае пастаяннай крыніцы даходу. Да 2017 года ў Іраку



разлічвалі, што пасля перамогі над групоўкай «Ісламская дзяржава» вызваленыя сродкі інвесцыюць у рэальны сектар. Аднак чаканага пасляваеннага эканамічнага росквіту не адбылося.

Прынамсі частка іракскага грамадства незадаволеная і знешнепалітычным курсам Багдада. На дэманстрацыях без адабрэння ўспамінаюць збліжэнне з суседнім Іранам, які мае шматлікіх ворагаў у рэгіёне. Распаўсюджваюцца чуткі, што Тэгеран, зацікаўлены ў захаванні ўрада, нібыта накіраваў спецназ для падаўлення пратэстаў. На гэтым фоне некаторыя з незадаволеных паляць сцягі Ісламскай рэспублікі. Але аднолькава нядобразычліўцы знайшліся і ў Саудаўскай Аравіі, на офіс тэлекампаніі якой здзейснілі напад.

У першыя дні пратэстаў улады зрабілі стаўку на падаўленне руху сілай. Супрацоўнікі правапарадку блакіравалі плошчу Тахрыр у цэнтры Багдада, куды спадзяваліся прабрацца дэманстранты. У 2011 годзе ў лакацыі з той жа назвай у Каіры праходзілі пратэсты, вынікам якіх стала рэвалюцыя



ў Егіпце, нагадвае tass.ru. Улады ў Іраку палічылі справай прынцыпу не дапусціць мітынгоўцаў на свой Тахрыр. 4-5 кастрычніка паміж дэманстрантамі і праваахоўнікамі ў Багдадзе прайшлі сутыкненні недалёка ад плошчы. Паліцэйскія пусцілі ў ход слёзатачывы газ, а затым пачалі страляць на паражэнне. Дэманстранты таксама ўжылі сілу. Вынікам стала гібель людзей з абодвух бакоў.

Пасля некалькіх дзён кровапралітных сутыкненняў урад пайшоў на эканамічныя саступкі. «Дэманстрацыі з'яўляюцца важнай падзеяй і выдатнай магчымасцю для рэформаў, якія вырашылі б праблемы, што назапашваюцца на працягу доўгага перыяду часу», — адзначыў прэм'ер-міністр Ірака Адэль Абдэль Махдзі. Аб гэтым паведаміў тэлеканал «Ас-Сумар». Палітык заклікаў дэманстрантаў не вінаваціць у карупцыі ўрад, «жыццё якога не перавышае некалькіх месяцаў». «На працягу нашай работы ў краіне ўзрасла эканамічная актыўнасць», — заўважыў прэм'ер.

## Папа, генсек і аятала

Кіраўнік іракскага ўрада абвясціў павышэнне сацыяльных выплат сем'ям, якія жывуць у нястачы, намер пабудаваць 100 тысяч новых дамоў і запуск праграм па перанавучанні для 150 тысяч беспрацоўных. Таксама прэм'ер-міністр заявіў пра намер правесці перастаноўкі ва ўрадзе і скараціць заробкі высокапастаўленых чыноўнікаў. Аднак дэманстранты засталіся незадаволенымі. У канцы кастрычніка выступленні аднавіліся з новай сілай і неўзабаве ахапілі ўсю краіну. Службы бяспекі пачалі разганяць мітынгоўцаў з асаблівай жорсткасцю, адкрываючы агонь на паражэнне.

28 лістапада стала самым крывавым днём з моманту пачатку пратэстаў. У Багдадзе, Наджафе і Насіры ад рук сілавікоў загінула не менш за 40 чалавек. Amnesty International назвала гэты дзень крывавай лазняй. Заклапочанасць тым, што адбываецца ў Іраку, выказаў генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш. У мінулую нядзелю Папа Рымскі Францыск выступіў з асуджэннем гвалту з боку сіл бяспекі ў адносінах да пратэстоўцаў. «З болем я даведаўся пра дэманстрацыі пратэсту ў апошнія дні і пра жорсткую рэакцыю на іх, якая прывяла да дзясяткаў ахвяр», — сказаў пантыфік падчас штотыднёвага благаслаўлення вернікаў. Папа паведаміў, што мае намер наведаць Ірак налета.

Тым не менш сутыкненні працягнуліся ў нядзелю ў многіх іракскіх гарадах, у тым ліку ў Багдадзе і Эн-Наджафе. Духоўны лідар іракскіх шыітаў, вялікі аятала Алі Сістані (французскі часопіс Le Point называе яго «нябачным гаспадаром Ірака») у пропаведзі ў Кербеле асудзіў урад за выкарыстанне сілы супраць удзельнікаў пратэстаў і заклікаў да перавыбараў. Як вынікае з заявы прэм'ер-міністра, менавіта пазіцыя Сістані стала для яго вырашальным аргументам на карысць рашэння аб адстаўцы. Абдэль Махдзі заявіў, што пакіне сваю пасаду з-за масавых антыўрадавых выступленняў.

Яго прашэнне аб адстаўцы было зацверджана іракскім парламентам 1 снежня. Аднак рашэнне кіраўніка ўрада ніяк не паўплывала на інтэнсіўнасць пратэсных акцый, якія працягваюцца насуперак усім мерам, што прымаюцца палітычным істэблішментам. «Адстаўка Адэля Абдэль Махдзі не з'яўляецца рашэннем праблемы, — заявіў у Басры актывіст Алі Абдэль Амір, якога цытуе Бі-бі-сі. — Махдзі — толькі частка праблемы, бітая фігура ў шахматнай партыі. Праблема — у сістэме, якая прывяла яго да ўлады». Палітычны лідар іракскіх шыітаў Мактада ас-Садр таксама адзначыў, што адстаўка Махдзі — першы, але не апошні плод рэвалюцыі. «Майце на ўвазе, што яго адстаўка не азначае канец карупцыі», — заявіў ас-Садр у «Твітэры». Ён заклікаў правесці адкрытыя і сумленныя выбары і заснаваць антыкарупцыйны камітэт.

Кансультацыі па выбары кандыдатуры новага прэм'ер-міністра Ірака прэзідэнт блізкаўсходняй краіны Бархам Салех пачаў 3 снежня. Абмеркаванне іракскі прэзідэнт вядзе з усім спектрам палітычных сіл. Чыноўнікі ў Багдадзе сцвярджаюць, што гэтая задача такая ж цяжкая, як і спробы пераканаць маніфестантаў спыніць свае акцыі. Крытэрыі і ўмовы ў дачыненні да будучага кіраўніка іракскага ўрада, якія вылучаюць некаторыя блокі, у тым ліку намінацыю незалежнай фігуры па-за цяперашняй палітычнай структурай, дасюль носяць больш дэманстратыўны характар і падобныя на падлашчванне да ўдзельнікаў антыўрадавых выступленняў, сцвярджаюць іракскія афіцыйныя асобы. Зрэшты, цяжка спрачацца з тым, што бягучая сітуацыя патрабуе пошуку абсалютна неангажаванага палітыка, да якога не будзе прэтэнзій з нагоды яго прыналежнасці да якой-небудзь з сістэмных унутраных ці знешніх сіл.

Пасля адстаўкі Адэля Абдэль Махдзі было агучана мноства імёнаў, сярод іх розныя былыя дзяржаўныя памочнікі, экс-міністр, суддзя, аднак яны знаходзіліся недалёка ад палітычнага цэнтра ці кантактаў з палітычным істэблішментам, што магло б угнявіць іракскую вуліцу. Паводле канстытуцыі, пасля працэдуры адхілення прэм'ера прэзідэнт павінен даручыць фарміраванне новага ўрада прадстаўніку ад партыі парламенцкай большасці, на што адводзіцца два тыдні і адзін дзень. Аднак блок уплывовага шыіцкага прапаведніка Муктады ас-Садра «Саірун» адмовіўся вылучаць свайго кандыдата на пасаду прэм'ера.

## Вялікая гульня

Колькасць забітых за дзень ідзе ўжо на дзясяткі, а ўсяго з пачатку пратэстаў, па неафіцыйных звестках, загінула каля 400 чалавек. Але ўжыванне агнястрэльнай зброі і ўведзеная ўладамі каменданцкая гадзіна не спыняюць пратэстоўцаў. У Іраку працягваюць гінуць маніфестанты. Так, напярэдадні парламентарыі накіравалі спецыяльныя камісіі ў Ды-Кар і Наджаф для расследавання здзейсненых у гэтых правінцыях злачынстваў, у выніку якіх толькі за мінулы тыдзень ахвярамі сталі каля 70 чалавек.

Пры незвычайнай для стыхійнага пратэсту працягласці мітынгоўцы маюць выразную палітычную мэту, у тым ліку знешнепалітычную. Цяжка сабе ўявіць, каб іракская моладзь, якая бунтуе на вуліцах, сама наўпрост звязала сваю беднасць з уплывам Тэгерана ў іх краіне. Кола «падазраваных» у падагграванні незадаволенасці з антыіранскай скіраванасцю вельмі шырокае. Нядобразычліўцаў у Ірана мноства, але асноўныя праціўнікі, здольныя на арганізацыю падобных акцый, — гэта ЗША, Ізраіль і Саудаўская Аравія. Аднак супраць удзелу Саудаўскай Аравіі ў цяперашніх акцыях пратэсту сведчыць тое, што беспарадкамі ахоплены перш за ўсё шыіцкія раёны Ірака, а ўплыў Эр-Рыяда моцны сярод сунніцкага насельніцтва.

Ізраіль больш занепакоены прысутнасцю Ірана ў паўднёвых раёнах Сірыі (яны мяжуюць з Ізраілем), чым яго ўплывам у шыіцкім Іраку. А вось прэзідэнт ЗША Дональд Трамп, які даўно праводзіць лінію на эканамічнае ўдушэнне Ісламскай рэспублікі, мае падставы быць незадаволеным паводзінамі Ірана ў Іраку. У пачатку гэтага года парламент Ірака аб'явіў пра распрацоўку законапраекта аб разрыве дагавора па бяспецы з ЗША, які прадугледжвае вывад з краіны амерыканскіх ваенных баз. Нагодай для абвастрэння адносін стаў неаб'яўлены візіт Трампа ў Ірак, на ваенна-паветраную базу Айн аль-Асад (дарэчы, тую самую, якую днямі абстралялі ракетамі), у канцы снежня мінулага года. Іракскі бок не папярэдзілі, па-першае, з меркаванняў бяспекі, а па-другое, таму, што нікога не цікавіла яго меркаванне. Наўрад ці іракскія парламентарыі сур'ёзна разлічвалі дамагчыся вываду амерыканскіх войскаў — хутчэй ЗША вывелі б з Ірака цяперашні склад парламента, аднак спроба «бунту» была ў наяўнасці, заўважае expert.ru. Але ўсё ж ЗША змагаюцца не з іранскім уплывам у Іраку, а з самім Іранам, і ў іх ёсць працейшыя рычагі, каб змяніць іракскі ўрад.

Горш за ўсё, як для Ірака і Ірана, так і для ЗША, Ізраіля і Саудаўскай Аравіі, калі за пратэстамі стаіць «Ісламская дзяржава». Пацярпеўшы паражэнне ў Іраку і Сірыі, рух сышоў у падполле і не супраць таго, каб вярнуць сабе страчаныя тэрыторыі. Адкрытае выступленне пад сцягамі «Ісламскай дзяржавы» пагражае неадкладным паражэннем: усе вышэйпералічаныя краіны, забыўшыся пра супярэчнасці, хутка знішчаць тэрарыстаў. Стварэнне ж хаосу ў Іраку і абвастрэнне супярэчнасцяў паміж яго сапернікамі пакуль на руку адной ІД, мяркуе expert.ru.

«Абстаноўка напружаная, і ёсць падставы лічыць, што пратэсты працягнуцца доўга, — заўважыў у размове з tass.ru ўсходазнаўца, выкладчык Вышэйшай школы эканомікі Рыгор Лук'янаў. — Праводзіць паралелі з «арабскай вясной» рызыкоўна, і ўсё ж падобныя элементы прысутнічаюць. Корань бедстваў — нездольнасць эканамічнай і сацыяльнай сістэмы рэанімавацца пасля многіх гадоў разбуральных баявых дзеянняў. Справы ў сацыяльнай сферы ідуць дрэнна, дзяржапарат заражаны карупцыяй. Пасля таго як абвясцілі перамогу над «Ісламскай дзяржавай», больш няма апраўдання ў выглядзе тэрарыстычнай пагрозы. Глыбінныя прычыны паходзяць з 2003 года, калі пасля звяржэння Садама Хусейна баланс сіл у краіне быў беспаваротна разбураны», — рэзюмаваў эксперт. Таму да наведзення парадку ў Іраку, на жаль, яшчэ вельмі далёка.

**Захар БУРАК.**

# Правила проведения рекламной игры «Простая арифметика»

**1.** Настоящая Рекламная игра называется «Простая арифметика» (далее – Игра), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее – Правила) согласно требованиям законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры платы.

**2. Сведения об организаторе.**

**2.1.** Организатором Игры является Общество с ограниченной ответственностью «360 Медиа групп», УНП 690318126, зарегистрировано решением Минского районного исполнительного комитета № 0046451 от 11 апреля 2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690318126, свидетельство о государственной регистрации выдано 24 апреля 2008 г. (далее – Организатор).

**2.2.** Юридический адрес и местонахождение Организатора: 223051 Минская обл., Минский р-н, а. г. Острошицкий Городок, ул. Ленина, 1-3, каб. 3-1-21.

**2.3.** Электронный адрес Организатора: **visa@360.by**

**3. Территория проведения Игры.**

Игра проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Срок начала и окончания Игры.**

Игра проводится с 10 декабря 2019 года по 1 марта 2020 года (включая период розыгрышей, вручения призов и публикацию результатов проведения Рекламной игры).

**5. Состав комиссии по проведению Игры.**

Председатель комиссии – Реут Юрий Леонидович, директор ООО «360 Медиа групп».

Заместитель Председателя комиссии – Полещук Евгения Константиновна, специалист по работе с клиентами ООО «360 Медиа групп».

Члены комиссии:

1. Бубен Дарья Васильевна, индивидуальный предприниматель.
2. Лукович Елена Игоревна – главный специалист управления продаж ОАО «Белинвестбанк».
3. Клименкова Олеся Игоревна, индивидуальный предприниматель.

Данная комиссия создана для контроля за соблюдением официальных Правил Игры, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Игры.

**6.** Наименование товаров и/или услуг, или их групп, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра.

**6.1.** Игра проводится в целях стимулирования безналичных расчетов (далее – безналичные операции) физическими лицами с использованием банковских платежных карточек Visa (далее – «Карточка»), эмитированных ОАО "Белинвестбанк" (далее – Банк) для физических лиц.

**6.2.** При использовании в Правилах термин «банковская платежная карточка» используется в значении, определенном статьей 273 Банковского кодекса Республики Беларусь: «Банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь».

**7. Участники Игры.**

**7.1.** Участниками Игры могут быть физические лица, держатели Карточек, достигшие 18 лет, являющиеся гражданами Республики Беларусь, а также иностранными гражданами и лицами без гражданства, имеющими вид на жительство в Республике Беларусь (далее – «Участники»).

**7.2.** Участниками Игры не могут быть лица, состоящие в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники, лица, находящиеся с такими лицами в отношениях свойства, а также члены комиссии по проведению Рекламной игры.

**8. Условия участия в Рекламной игре.**

**8.1.** Для участия в Рекламной игре необходимо в периоды:

**с 00 часов 00 минут 10 декабря 2019 года и не позднее 23 часов 59 минут 14 декабря 2019 года** включительно;

**с 00 часов 00 минут 17 декабря 2019 года и не позднее 23 часов 59 минут 21 декабря 2019 года** включительно;

**с 00 часов 00 минут 24 декабря 2019 года и не позднее 23 часов 59 минут 28 декабря 2019 года** включительно;

**с 00 часов 00 минут 21 января 2020 года и не позднее 23 часов 59 минут 25 января 2020 года** включительно;

**с 00 часов 00 минут 28 января 2020 года и не позднее 23 часов 59 минут 1 февраля 2020 года** включительно (далее – период участия):

**8.1.1.** подключить систему интернет-банкинг на сайте Банка https://ibank.belinvestbank.by, указав Ф.И.О., номер мобильного телефона, адрес электронной почты;

**8.1.2.** дать согласие на участие в Игре в личном кабинете в интернет-банкинге на сайте Банка: **https://ibank.belinvestbank.by** в разделе «Настройки» – «Настройка согласия на участие в рекламных кампаниях» проставить галочку рядом «Согласен (-на) участвовать в Рекламной игре»;

**8.1.3.** совершить 2 (две) безналичные операции в день, каждая из которых эквивалентна сумме 10,00 (десять) белорусских рублей и более, с использованием Карточки или ее реквизитов по оплате товаров/работ/услуг, в том числе онлайн платежи, за исключением операций, перечисленных в п. 8.3. в каждый из периодов розыгрышей.

**8.2.** Каждые 2 (две) безналичные операции в день, соответствующие Правилам, получают 1 (один) шанс на участие в розыгрыше призов согласно порядку проведения розыгрыша (п. 10) (например, 10 (десять) безналичных операций в день, соответствующих Правилам, получают 5 (пять) шансов на участие в розыгрыше.

**8.3.** Не являются основанием для участия в Игре:

**8.3.1.** безналичные операции, совершенные до и после периода, указанного в п. 8.1.;

**8.3.2.** безналичные операции на сумму, не соответствующую условиям п. 8.1.3.;

**8.3.3.** операции по снятию наличных денежных средств или пополнению карт-счета;

**8.3.4.** операции, совершенные посредством банкоматов и инфокиосков, мобильного и интернет-банкинга;

**8.3.5.** операции по переводу денежных средств с одной банковской платежной карточки на другую банковскую платежную карточку;

**8.3.6.** операции по оплате налогов, государственных пошлин, сборов и иных обязательных платежей;

**8.3.7.** операции по размещению (пополнению) депозитов, оплате кредитных обязательств и банковских комиссий;

**8.3.8.** операции, совершенные в кассах отделений банков;

**8.3.9.** операции по оплате услуг мобильных операторов;

**8.3.10.** операции, совершаемые в подразделениях РУП «Белпочта»;

**8.3.11.** все операции участника, если будет установлено, что по части (от четырех и более) или всем из них в течение периода участия в Игре совершены необоснованные системные возвраты на карточку сумм, зафиксированных к участию в Игре операций (далее – «операции с необоснованным системным возвратом сумм на карточку»). Для проверки Организатор вправе обратиться к третьим лицам для уточнения обоснованности системных возвратов от них на карточку участника.

**8.4.** Организатор оставляет за собой право проверки данных о достоверности совершенных операций Победителями Игры, в том числе обратиться в Банк в целях проверки зарегистрированной операции в Игре.

**9. Состав и размер призового фонда.**

Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества и денежных средств Организатора. Общий размер Призового фонда составляет 11 626,25 (Одиннадцать тысяч шестьсот двадцать шесть белорусских рублей двадцать пять копеек).

*Таблица 1*

| Выигрыш | Кол-во, шт. | Цена единицы с НДС в BYN | Всего с НДС |
|---|---|---|---|
| 56304 Телефон GSM-A Samsung Galaxy G973F/DS S 10 126 Gb аквамарин стоимостью 2 040,00 бел. руб. + денежная сумма в размере 285,25 бел. руб, далее – смартфон | 5 | 2 325,25 | 11 626,25 |
| **Итого:** | | | **11 626, 25** |

**10. Место, дата, время и порядок розыгрыша призового фонда, порядок определения выигравшего Участника Игры.**

**10.1.** Место проведения розыгрыша призов – г. Минск, ул. Интернациональная, д. 25А, 4-й этаж, офис 425.

**10.2.** Всего за период проведения Игры Организатором проводится 5 (пять) розыгрышей призового фонда, согласно *Таблице 2*, в ходе которых Победители будут определяться из числа шансов участников, совершивших безналичные операции, соответствующие Правилам Игры:

*Таблица 2*

| Номер розыгрыша | Дата и время розыгрыша | Участвуют безналичные операции согласно п. 8.1 данных Правил в период | Призы розыгрыша |
|---|---|---|---|
| 1 | 26.12.2019 16.00 | С 10 декабря 2019 г. (00.00) по 14 декабря 2019 г. (23.59) включительно | Смартфон – 1 шт. |
| 2 | 08.01.2020 16.00 | С 17 декабря 2019 г. (00.00) по 21 декабря 2019 г. (23.59) включительно | Смартфон – 1 шт. |
| 3 | 13.01.2020 16.00 | С 24 декабря 2019 г. (00.00) по 28 декабря 2019 г. (23.59) включительно | Смартфон – 1 шт. |
| 4 | 05.02.2020 16.00 | С 21 января 2020 г. (00.00) по 25 января 2020 г. (23.59) включительно | Смартфон – 1 шт. |
| 5 | 13.02.2020 16.00 | С 28 января 2020 г. (00.00) по 01 февраля 2020 г. (23.59) включительно | Смартфон – 1 шт. |

**10.3.** Для осуществления розыгрыша Организатор формирует Список Участников, в котором присваивает всем лицам, которые выполнили пункт 8.1 данных Правил уникальные порядковые номера в хронологическом порядке согласно дате и времени совершения второй безналичной операции, соответствующей п. 8.1 Правил. В случае совпадения у нескольких участников даты и времени совершения второй безналичной операции в организации торговли и сервиса порядковые уникальные номера им присваиваются по фамилии, имени и отчеству по алфавиту. Итоговый Список Участников включает порядковые уникальные номера участников, фамилию, имя, отчество участника (полностью), номер мобильного телефона участника, адрес места регистрации, подтверждение о совершении операций (дата, время и сумма двух безналичной операции).

**10.4.** Для проведения каждого розыгрыша используются специальный вращающийся барабан и набор шаров в количестве 10 (десяти) штук с номерами от 0 (нуля) по 9 (девять).

**10.5.** Из состава Комиссии выбирается секретарь для извлечения шаров из барабана.

**10.6.** Определение выигрышного номера происходит путем его формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из барабана.

**10.7.** Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера секретарь помещает в барабан шары с номерами от 0 (нуля) по первую слева цифру последнего порядкового номера в Списке Участников. Секретарь извлекает из барабана один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

**10.8.** После этого в барабан загружаются все 10 десять шаров, шары перемешиваются и из барабана извлекается шар, номер которого определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Номер шара вносится в протокол, производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах порядковых номеров в Списке Участников и при наличии совпадения выпавший номер шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера. В противном случае извлеченный шар не возвращается в барабан, и секретарь извлекает следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон соответствующих разрядов порядковых номеров в Списке Участников.

**10.9.** После определения победителя розыгрыша для обеспечения полной выдачи призов Организатор осуществляет определение одного резервного выигрышного номера. Резервные победители определяются в соответствии с п. 10.4 – 10.8 Правил.

**11. Срок и способ информирования победителей розыгрыша. Место, порядок и срок вручения приза**.

**11.1.** В сроки, определенные в таблице 3, Организатор уведомляет победителя/резервного победителя о выигрыше по электронной почте, а также дополнительно по контактному номеру телефона, указанными при подключении интернет-банкинга.

*Таблица 3*

| № розыгрыша | Сроки уведомления победителя | Сроки выдачи приза победителю | Сроки уведомления резервного победителя | Сроки выдачи приза резервному победителю |
|---|---|---|---|---|
| 1 | По 30.12.2019 включительно | По 08.01.2020 включительно | По 11.01.2020 включительно | По 16.01.2020 включительно |
